ЗВЯЗДА

29 ліпеня 1998 г. серада, № 149 (23500)

• выдаецца са жніўня 1917 г. • БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА • кошт 3000 рублёў

«ЗЯЛЁНЫ ДАХ» МІНСКА АБРУШЫЎСЯ НА ГАЛОВЫ ГАРАДЖАН

Празмерная любоў мінчан да зялёных насаджэнняў ледзь не прывяла да трагедыі. У час непагадзі ў другой палове дня ў мінулую пятніцу на тэрыторыю дзіцячага сада, што па вуліцы Казінца, рухнулі дзве агромністыя таполі.

У адміністрацыі прадпрыемства «Мінскзяленбуд» карэспандэнту БЕЛТА паведамілі, што яшчэ год таму былі вызначаны так званыя «аварыйныя» дрэвы, якія падлягалі высечцы. Аднак хваля пратэсту з боку экалагічных арганізацый і простых грамадзян прымусіла Мінгарвыканкам згарнуць гэту праграму. Кропкі над «і» паставіла мінулая пятніца, калі «зялёны дах» літаральна абрушыўся на галовы гараджан. На транспартныя магістралі, жылыя будынкі, аўтамабілі, у двары ўпалі 78 буйных дрэў. Толькі па шчаслівай выпадковасці абышлося без чалавечых ахвяр.

Вячаслаў ПЛАТУН, БЕЛТА.

ГЭТА МЫ, ГОСПАДЗІ!

А НА ЗАКУСЬ ПУСЦІЛІ... ДВАРНЯКА

Што і казаць, любяць павесяліцца-пагуляць некаторыя прадстаўнікі нашай моладзі, асабліва калі «возьмуць на грудзі» добрую порцыю спіртнога. І што характэрна, іхнія фантазіі на гэту тэму бязмежныя. Вось як, напрыклад, у Жлобіне.

Тут апошнім часам моладзь наладзіла сабе вячэрні адпачынак у будынку аднаго з рэстаранаў, які не працаваў. Падлеткі арганізавалі абслугоўванне на свой капыл: пасля выпівак і гарачай закускі (самі гатавалі яе ў рэстаране) танцавалі пад музыку, «балдзелі». А калі звычайныя стравы надакучылі, пусціліся на смелы эксперымент: зарэзалі здаравеннага дварняка і засмажылі. З'елі ж яго, вядома, пад выпіўку, пасля чаго хваліліся: мяса — смачнейшае чым зайчаціна. Пасля рэстарана падлеткаў-жывадзёраў запрасілі ў міліцыю.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

ПАТРАБАВАННІ ПРАФСАЮЗАЎ ПРАМЫСЛОВАСЦІ

Афіцыйная рэакцыя беларускага кіраўніцтва на патрабаванні прафсаюзаў прамысловасці, што прагучалі на мітынгу 15 ліпеня, выказана ў лісце за подпісам віцэ- прэм'ера ўрада Валерыя Кокарава, які атрымалі вядучыя галіновыя прафсаюзы.

Нагадаем, што сярод асноўных патрабаванняў, вылучаных падчас масавай акцыі 15 ліпеня, былі наступныя: мінімальная аплата працы не ніжэй за мінімальны спажывецкі бюджэт; павысіць узровень заработнай платы на прадпрыемствах да 12—15 мільёнаў рублёў у месяц; забяспечыць выкананне генеральнага і тарыфных пагадненняў, а таксама калектыўных дамоў; спыніць рост цэн і інфляцыю; надаць заработнай плаце статус першачарговага плацяжу і некаторыя іншыя.

Як паведамілі БелаПАН у Рэспубліканскім прафсаюзе работнікаў аўтамабільнага і сельскагаспадарчага машынабудавання, у сваім лісце віцэ-прэм'ер паведамляе, што патрабаванні ўдзельнікаў мітынгу ў ліку іншых пытанняў будуць разгледжаны ў першай дэкадзе жніўня на пасяджэнні Нацыянальнага савета па працоўных і сацыяльных пытаннях — рэкамендацыйнага органа, у які ўваходзяць прадстаўнікі ўрада, прафсаюзаў і наймальнікаў.

Ірына ЛЕЎШЫНА, БелаПАН.

ПАГАНКА БЕЛАЯ, А ВЫНІКІ — ЦЁМНЫЯ

Двух дзяцей 8 і 11 гадоў і іх дзядулю, якія атруціліся грыбамі, не ўдалося ўратаваць рэаніматарам Віцебска.

Збіралі лясныя дары дзеці. На вячэру іх гатавала бабуля, у якой не вельмі добры зрок. І ў выніку сем чалавек, чацвёра з якіх дзеці, апынуліся ў бальніцы.

Спецыялісты дзіцячага аддзялення рэанімацыі Віцебскай абласной дзіцячай бальніцы звярнуліся да аматараў грыбоў з перасцярогай. Сёлета, на думку ўрачоў, надзвычай складана распазнаць белую паганку, якая хутчэй за ўсё і забрала тры жыцці. Звычайна яе адрозніваюць ад белай сыраежкі па «паяску», але гэтым летам ён часта аказваецца прыбітым дажджом або ападае ў кошыку. Вядома, што таксіны захоўваюцца ў белай паганцы нават пры самай доўгай варцы, а скрыты перыяд атручэння працягваецца амаль 36 гадзін. Вось чаму выратаваць чалавека бывае немагчыма.

Вольга СІДАРОВІЧ, БЕЛТА.

ЛЯСНЫХ ПАЖАРАЎ ПАКУЛЬ НЕ БЫЛО

Як паведамілі карэспандэнту «Звязды» ў Галоўным упраўленні ваенізаванай пажарнай службы, за мінулыя выхадныя ў Беларусі адбыліся 73 пажары. У лясах і на тарфяніках пакуль, на шчасце, узгаранняў не здаралася.

Агнём было пашкоджана 40 будынкаў, 7 адзінак тэхнікі, знішчана 15 тон кармоў. Урон склаў 607 мільёнаў рублёў. У агні загінулі два чалавекі. Прычына смерці аднолькавая — курэнне ў ложку.

Мікалай ЛІТВІНАЎ.

ФУТБОЛ. ЧЭМПІЯНАТ БЕЛАРУСІ

«ДЫНАМА-93» «ДАГУЛЯЛАСЯ» ДА ДЫСКВАЛІФІКАЦЫІ

Сумна завяршыўся дэмарш сталічнай каманды «Дынама-93» у адносінах да байкатавання некаторых матчаў VIII чэмпіянату Беларусі па футболу ў вышэйшай лізе.

Калі пасля першай няяўкі ў Віцебск іх яшчэ «пранесла», то пасля адмовы ад гульні ў мінулую суботу з мінскім «Дынама» чаша цярпення ў Беларускай федэрацыі футбола перапоўнілася. На выканкаме БФФ было прынята рашэнне аб дыскваліфікацыі ўказанай каманды з чэмпіянату. Прычым ніякіх «пракурорскіх санкцый» на такі непапулярны ход не спатрэбілася. Згодна з рэгламентам правядзення нацыянальнага чэмпіянату, за дзве няяўкі на гульню без уважлівых прычын выканкам здымае каманду са спаборніцтваў.

Гэтым жа дакументам агаворана: калі клуб, які дыскваліфікуецца, згуляў у чэмпіянаце менш як 50 працэнтаў гульняў, то ўсе вынікі праведзеных матчаў анулююцца.

У дадатак да ўсяго рашэннем выканкама БФФ ЗАТ ФК «Дынама-93» аштрафавана на 25 мільёнаў рублёў.

У сёлетнім футбольным першынстве засталося 15 каманд.

Вось як цяпер выглядае турнірная табліца

	Г	В	Н	П	М	А
1. Днепр-Трансмаш	15	12	1	2	33-6	37
2. Тарпеда	15	8	5	2	28-9	29
3. Гомель	15	8	5	2	21-12	29
4. Белшына	15	8	4	3	28-12	28
5. БАТЭ	15	8	2	5	30-19	26
6. Славія	15	7	5	3	23-18	26
7. Тарпеда-Кадзіна	15	7	4	4	20-16	25
8. Лакаматыў-96	15	6	4	5	16-13	22
9. Дынама (Мн)	14	6	3	5	19-13	21
10. Нёман	15	5	5	5	13-19	20
11. Дынама (Бр)	15	5	1	9	15-23	16
12. Шахцёр	15	4	4	7	14-28	16
13. Нафтан-Дэвон	15	2	2	11	12-31	8
14. Маладзечна	15	1	1	13	10-33	4
15. Камунальнік	15	0	4	11	5-35	4

Уладзімір ЗДАНОВІЧ.

КУРСЫ АБМЕНУ НАЯЎНЫХ ВАЛЮТ У КАМЕРЦЫЙНЫХ БАНКАХ І АФІЦЫЙНЫ КУРС, УСТАНОЎЛЕНЫ НАЦЫЯНАЛЬНЫМ БАНКАМ НА 28 ЛІПЕНЯ 1998 г. (па стану на 15.00)

Назва банка	USD		DM		RUR		Тэлефон для даведак
	Купля	Продаж	Купля	Продаж	Купля	Продаж	
Мінск (0-17)							
Белпрамбудбанк	57000	58000	31600	32500	8700	9200	233-2110
Мінсккомплексбанк	57500	58000	32250	32800	9150	9300	228-2047
Пріорбанк	56500	58000	31800	32500	8900	9200	245-5721
Нацыянальны банк РБ (курс для безнаяўных разлікаў)	41400.00		23210.00		6600.00		Курс на 29.07.1998
Цэнтрабанк Расіі	6.2320		3.4941				

На працягу дня ўстаноўленыя курсы могуць мяняцца, курсы галаўнога ўпраўлення банка могуць неістотна адрознівацца ад курсаў, устаноўленых у абменных пунктах. Інфармацыя атрымана ад галаўных упраўленняў негандлёвых аперацый адпаведных банкаў.

Агенцтва ГРАЎЦОВА.

Рынкавы намінальны курс (міжбанкаўскі рынак)	70000	72000	39183	40314	11157	11477
Рэальна абгрунтаваны курс	66000	66500	36800	37300	10100	10600

Усміхнёмся!

Малюнак Леаніда РАЗЛАДАВА.

Стары на прыёме ва ўрача:

— Доктар, у апошні час у мяне нічога не атрымліваецца з жанчынамі.

— А колькі вам гадоў?

— 72.

— Ну-у-у, ведаеце, у вашым узросце гэта натуральна!

— А вось у мяне прыяцель, яму 84, дык ён кажа...

— Ну і вы кажыце...

Жонка — мужу:

— Раней ты быў шчаслівы, калі бачыў мяне хоць некалькі хвілін у дзень!

— І зараз таксама!

У кожнага пачатку ёсць два канцы. Так і ў сонца, якога так доўга чакалі, яшчэ тыдзень таму ўглядаючыся з сумам у бездань нябесную. Выглянула яно і накрыла ўсіх коўдрай спякоты. Рэдка калі беларускі тэрмометр дапаўзае да рыскі 30—32°. А ў гэтым годзе такое ўжо было. Усё самлела: замарудзіўся рытм будаўніцтва і жыцця наогул. Транспарт, здавалася, не ездзіў, а плаваў па пластыліну асфальту. Затое ж рэзка падскочыла выручка ў гандляроў рознага роду напоямі. Хто ж гэта дазволіць сабе засохнуць, калі такі выбар?

Фота Максіма МАЛІНОЎСКАГА.

Канікулы — вясёлая пара...
Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЧЫМ ВАБІЦЬ АБІТУРЫЕНТА ПСІХАЛОГІЯ?

Сёлета самы высокі конкурс у ВНУ краіны (9,1 чалавека на месца) зарэгістраваны на спецыяльнасці «псіхалогія» ў Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце. Аб гэтым «Звяздзе» паведамілі ў Галоўным упраўленні вышэйшай адукацыі Міністэрства адукацыі РБ.

Традыцыйна ў спісе лідэраў прысутнічае і такая спецыяльнасць як «акцёрскае майстэрства драмы і кіно» (Беларуская акадэмія мастацтваў) — 7,5 чалавека на адно месца. Зусім нязначна саступае ёй «рэжысура» ў Беларускім універсітэце культуры — 7,3 чалавека.

У Беларускім жа дзяржаўным універсітэце найбольш жорсткі конкурс прыйшлося прайсці тым абітурыентам, хто прэтэндаваў атрымаць дыплом сацыёлага (6,7 чалавека). Дарэчы, гэта спецыяльнасць становіцца ў нашым грамадстве ўсё больш папулярнай.

Па-ранейшаму не праходзіць у беларускай моладзі і цікавасць да правазнаўства: у Беларускім дзяржаўным эканамічным універсітэце за адно бюджэтнае месца на гэтую спецыяльнасць спрачаліся 5,2 чалавека (гэта самы высокі конкурс у БДЭУ). Няцяжка было спрагназіраваць і большы, у параўнанні з іншымі, конкурс у тэхнічных ВНУ на эканамічныя спецыяльнасці: напрыклад, у Беларускім аграрным тэхнічным універсітэце на спецыяльнасці «эканоміка і кіраванне на прадпрыемстве» назіраўся конкурс 5,5 чалавека, а на аналагічнай спецыяльнасці ў Віцебскім тэхналагічным універсітэце — 5,3 чалавека.

Між іншым, не абышлося ў сёлетняй прыёмнай кампаніі і без своеасаблівых парадоксаў: так, калі конкурс на найбольш прэстыжную, на думку абітурыентаў, спецыяльнасць у Мінскім лінгвістычным універсітэце «англійская мова» на перакладчыцкім факультэце складаў 5,3 чалавека, то прэтэндэнтаў на спецыяльнасць «фізічная культура і спорт» у Брэсцкім дзяржаўным універсітэце аказалася яшчэ больш — 6,5 чалавека на месца. Нечаканую цікавасць выклікала ў моладзі і новая спецыяльнасць «штучны інтэлект» (усё ж такі тэхнічная спецыяльнасць!) у Беларускім дзяржаўным універсітэце інфарматыкі і радыёэлектронікі (3 чалавекі на месца). А ў БДПА на спецыяльнасці «эксплуатацыя транспартных сродкаў конкурс дайшоў да 4,1 чалавека на месца.

Увогуле ж, як запэўнілі ў міністэрстве, у гэтым годзе ва ўсіх ВНУ краіны не знайшлося ніводнай спецыяльнасці, дзе колькасць пададзеных заяў была б меншая, чым колькасць выдзеленых бюджэтных месцаў.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ФЕСТЫВАЛЬНАЯ ХРОНІКА

НАШЫ ПЕСНІ ПРЫНОСЯЦЬ УДАЧУ

Сёлета на конкурсе маладых выканаўцаў «Славянскага базару ў Віцебску» ізноў «гран-пры» магла атрымаць Югаславія. Але спявак з Ізраіля Рафаэль добра ведаў, дзеля чаго ехаў у Віцебск. Ён ехаў перамагаць. І гэта яму ўдалося ў многім дзякуючы прадзюсеру Сямёну Газарку, які жыў у Беларусі да 90-х гадоў, а потым пераехаў на гістарычную радзіму. Ён ведаў узровень нашага конкурсу і ведаў, што акрамя добрых вакальных даных журы цэніць самабытнасць спевака.

Сапраўды, было што ацаніць. Рафаэль не з сям'і былых эмігрантаў, ён нарадзіўся і вырас у Ізраілі, працуе у адным з лепшых ансамбляў, якія абслугоўваюць святы і ўжо аб'ездзіў з ім ледзь не палову свету. Ён нават удзельнічаў у Ізраілі у адборачным туры «Еўрабачання». Тады спеваку не пашчасціла. А зараз ён перамог без усякай скідкі на шанцаванне. Для таго, каб прыехаць у Віцебск, Рафаэль таксама прайшоў праз адборачны конкурс, у якім удзельнічалі 16 прэтэндэнтаў. Сюды ён прыехаў, каб убачыць яшчэ адну краіну свету, і яшчэ таму, што «Славянскі базар» мае даволі вялікую аўдыторыю тэлегледачоў. Але асабліва запомніўся спявак з Ізраіля публіцы тым, што выдатна выканаў песню Ігара Лучанка «Зачараваная». Так, не здзіўляйцеся, Рафаэль, які не ведае рускай мовы, тым не менш спяваў на беларускай, а вымаўленню яго могуць пазайздросціць многія беларусы.

Увогуле на сёлетнім конкурсе як ніколі карысталіся папулярнасцю беларускія песні. Асабліва ў прадстаўнікоў іншых краін. Падобна, што нашы песні могуць прыносіць удачу. Юная прадстаўніца Беларусі Вікторыя Дзямянчук у першы дзень запомнілася па песні «Рэчанька». Не памылюся, калі скажу, што менавіта выступленне Вікторыі найбольш адпавядала сэнсу конкурсу «Славянскі базар у Віцебску». Адчуваецца, што ў дзяўчыны вялікі патэнцыял і калі яна сур'ёзна пачне працаваць на эстрадзе, знойдзе аўтараў, свой стыль, то здолее стаць цікавай артысткай. Падаецца, менавіта ў будучыню глядзела журы на чале з кампазітарам Ігарам Крутым, ацэньваючы выступленне Вікторыі Дзямянчук. Дзяўчына з Гродна заваявала 2-ю прэмію ў памеры 4 тысяч долараў, прапусціўшы наперад яшчэ Таню Банянін з Югаславіі.

Выступленне канкурсантаў з Югаславіі заўсёды прыносіла задавальненне. Яны паказвалі і прафесіяналізм, і прыродны талент, і класна зробленыя песні. Ва ўсе гады Югаславія прадстаўляла ў Віцебску самых моцных канкурсантаў. Таня Банянін таксама магла разлічваць на «гран-пры».

Затое апошняя з прэмій, трэцяя, яна ж самая маленькая — 2 тысячы долараў аказалася падзеленай на тры часткі. Праўда, як заўважыў Ігар Круты, дзве тысячы на тры не дзеліцца, таму журы са сваіх рэзерваў дадало яшчэ 100 долараў, каб па 700 атрымалі Яўгенія Уласава (Украіна), Радасціна Колева (Балгарыя), Эва Влязлоўская (Польшча).

Праўда, у грашовым вымярэнні іх апярэдзіла Гульнур Сатылганава з Кыргызстана. Яе выступленне выклікала найбольшую ўвагу ў прадстаўнікоў часопіса «Пракурорска-следчая практыка», і спявачцы уручылі 1000 долараў. Ізноў за беларускую песню «Ой, ляцелі гусі з броду».

Журы аказалася сапраўды добрым — найбольш моцных канкурсантаў не пакрыўдзіла. Вось толькі вынікі конкурсу чамусьці ўвесь час трымаліся ў сакрэце. Не абвяшчалі вынікаў пасля першага тура. Увогуле не было вядома, хто з членаў журы каму аддаў перавагу. Можна толькі ўявіць, як хваляваліся выканаўцы, адпраўляўшыся спаць у няведанні. Можна ўявіць, якая ў іх была ноч. Дарэчы, у суддзяў яна таксама была доўгая: журы палову ночы размяркоўвала месцы.

Тым не менш, трэба прызнаць, што конкурс прайшоў роўна. Упершыню ён не нагадваў элементарнае спаборніцтва, а быў арганізаваны ў выглядзе канцэртаў з элементамі шоу, дзе адчувалася рука рэжысёра Аляксандра Рэўзіна, якога запрасіў папрацаваць з канкурсантамі старшыня журы.

Конкурс паказаў не проста юнакоў і дзяўчат, якія жадаюць працаваць на сцэне. Перад намі былі артысты. Прыемна, што можна ганарыцца за Беларусь. Вікторыі Дзямянчук толькі 18 гадоў. І яна зрабіла добры выбар на карысць сучасна аранжыраваных песень, адмовіўшыся ад надакучыўшых набыткаў савецкай эстрады.

ВЯДУЧЫ — ГЭТА ПРАФЕСІЯ ЦІ ХОБІ?

«Славянскі базар у Віцебску-98» вылучаецца колькасцю вядучых. Яны мяняюцца амаль што на кожным канцэрце, а бывае — і па некалькі разоў за канцэрт. Раней асноўная нагрузка была ўскладзена на плечы прадстаўнікоў трох краін. Яны ж вялі і галоўную падзею фестывалю — конкурс маладых выканаўцаў. Сёлета традыцыя парушылася.

Колькасць вядучых узрасла. Мяркуючы па ўсім, прэстыж гэтай прафесіі таксама ўзрастае, таму што некаторыя эстрадныя спевакі ахвотна бяруцца за гэтую справу. Застаецца чакаць, што праз год колькасць перарасце ў якасць.

Ларыса ЦІМОШЫК.

г. Віцебск.

ЦІ ЗМОЖА РЭАЛІЗАВАЦЬ НАКОПЛЕНЫ ПАТЭНЦЫЯЛ «СКАРБНІЦА»?

Сёлетні год для цэнтра беларускіх рамёстваў «Скарбніца» не юбілейны. Хаця менавіта сёлета яны наладзілі вялікую выставу, якая стала своеасаблівай справаздачай калектыву, дала магчымасць паказаць усё тое лепшае, што змаглі зрабіць за 22 гады працы яе супрацоўнікі. Гледачы ўбачылі вырабы народных майстроў з саломкі, гліны, дрэва, а таксама саматканыя ўжыткова-побытавыя рэчы, адшуканыя і сабраныя супрацоўнікамі ў час шматлікіх экспедыцый па розных рэгіёнах Беларусі. Побач са старымі ручнікамі з бабулінага куфра ў экспазіцыі красаваліся не менш прыгожыя сучасныя рэчы, выкананыя маладымі майстрыхамі «Скарбніцы». Найбольш прывабнымі экспанатамі выставы была серыя рэгіянальных касцюмаў, выкананых для калектыву «Неруш», арыгінальныя тканыя вырабы, цацкі, сувеніры.

— Наш цэнтр павінен быць гордасцю рэспублікі і прадметам клопату ўрада, — сказала на адкрыцці выставы адна са старэйшых яго супрацоўніц загадчыца аддзела ткацтва Людміла Падабед. — Падобныя цэнтры дзейнічаюць цяпер толькі ў Расіі і ў Казахстане.

У Беларусі такі цэнтр, магчыма, ужо і не існаваў бы, каб не асабісты энтузіязм яго супрацоўнікаў і іх нерагодная адданасць справе.

...22 гады таму ў навукова-даследчую мастацкую эксперыментальную лабараторыю пры Упраўленні мастацкай прамысловасці Міністэрства мясцовай прамысловасці БССР сапраўды прыйшлі працаваць вялікія энтузіясты і рамантыкі — маладыя выпускнікі прафесійна-тэхнічных вучылішчаў і мастацкіх інстытутаў, народныя майстры. Яны жылі ідэяй адраджэння Беларусі, яе багатай народнай спадчыны. Лабараторыя была створана з мэтай вывучэння, аднаўлення і развіцця народных промыслаў Беларусі. Таму на першым этапе працавалі пераважна ў экспедыцыях па беларускіх вёсках, дзе на той час яшчэ жылі вядомыя народныя майстры, а ў сялянскіх куфрах захоўваліся саматканыя спадніцы, ручнікі, посцілкі, вышыванкі, пісанкі... Увесь гэты матэрыял даследаваўся, а старыя традыцыйныя тэхнікі былі рэкамендаваны мастацкім фабрыкам. Адначасова ішла метадычная работа з майстрамі, мастакамі, для іх наладжваліся семінары, стажыроўкі. У першыя гады існавання лабараторыі ў ёй функцыянавалі і ганчарная майстэрня, і кавальская. Аднак праз нейкі час яны спынілі сваю дзейнасць. У рэшце рэшт, у структуры лабараторыі склаліся чатыры аддзелы — мастацкага ткацтва, вышыўкі і страчавышытых вырабаў, аддзел распрацоўкі трыкатажных і дэкаратыўна-прыкладных вырабаў.

Здавалася б, выбраны накірунак дзейнасці лабараторыі павінен быў быць плённым для прамысловасці. Але ж іх саюз распаўся.

— Чаму так адбылося? — пацікавілася я ў Людмілы Падабед.

— У нас быў накоплены вялікі матэрыял. З'явілася кола сваіх заказчыкаў — артысты, мастацкія калектывы. З'явілася патрэба ў густоўным афармленні інтэр'ераў грамадскіх будынкаў, у высакаякасных сувенірах і г. д. І мы маглі задаволіць гэты грамадскі попыт. Аднак не мелі права выконваць індывідуальныя заказы. У сваю чаргу супрацоўніцтва з прадпрыемствамі таксама стрымлівала, не давала магчымасці рэалізаваць накоплены вопыт і патэнцыял. Умовы, як вядома, дыктаваў гандаль. Вырабы мясцовай прамысловасці, зробленыя на ручным ткацкім станку і на фабрычным хіба могуць быць аднолькавага кошту? Таму фабрыкі, дзе таксама былі добрыя мастакі, мусілі выконваць заказы, зыходзячы з існуючых матэрыялаў, парушаючы колеравыя прапорцыі. Таму казаць пра мастацкія якасці такой рэчы было ўжо складана.

Наступным этапам у гісторыі лабараторыі быў арэндны. У гэты час тут пачалі прымаць заказы на выраб сучасных рэчаў, тканін з выкарыстаннем народных матываў і традыцый, афармлялі інтэр'еры, эксперыментавалі, спалучаючы такія тэхнікі, як ткацтва і саломапляценне. На жыццё сабе зараблялі. А вось пра будучыню не паклапаціліся. Менавіта на гэтым этапе ў лабараторыі практычна распаўся аддзел мастацтвазнаўства, які раней ажыццяўляў усе экспедыцыйныя работы. Дарэчы, увесь экспедыцыйны матэрыял і дасюль не апрацаваны, не прааналізаваны. Якасць фотаматэрыялаў стала зусім кепская. Цяпер ужо патрэбна дадатковая апрацоўка слайдаў, каб зрабіць, скажам, навукова-метадычнае выданне. Спецыялісты лічаць, што частка гэтага матэрыялу беззваротна страчана, бо захоўвалася ў непрыстасаваным памяшканні.

— Душа баліць, калі бачыш і разумееш такую сітуацыю, — казала ў час гутаркі Людміла Падабед. — Мы, супрацоўнікі «Скарбніцы», адчуваем адказнасць за лёс народнай спадчыны.

Нельга сказаць, што супрацоўнікі лабараторыі, а пазней цэнтра народных рамёстваў паслухмяна плылі па цячэнню і нічога не рабілі, каб утрымліваць сітуацыю пад кантролем, не стаць ахвярамі абставін і аб'ектыўных эканамічных умоў. У свой час абмяркоўвалася магчымасць уваходу ў структуру Міністэрства культуры, у прыватнасці, у якасці вытворчай базы пры інстытуце праблем культуры. Але ж пытанне не было вырашана. Хаця ў паслугах цэнтра «Скарбніца» мелі патрэбу практычна ўсе арганізацыі, якія тым ці іншым бокам судакраналіся з культурай.

Як бы там ні было, але рух наперад усё ж ёсць. Былая лабараторыя, а потым цэнтр набыў цяпер статус навукова-вытворчага дзяржаўнага прадпрыемства і ўвайшоў у канцэрн мастацкай прамысловасці Рэспублікі Беларусь. Што ў сваю чаргу абяцае матэрыяльную дапамогу ў рамонце будынка, упарадкаванні прылеглай тэрыторыі. У штаце зноў з'явіўся прафесійны мастацтвазнавец. Хаця адзін чалавек, безумоўна, не зможа расчысціць існуючыя завалы, падрыхтаваць да выдання кнігу, апрацаваўшы ўвесь накоплены за гэтыя гады матэрыял.

На сённяшні дзень паспяховая работа прадпрыемства «Скарбніца» цалкам залежыць ад паступлення заказаў. Іх пакуль што дастаткова. Але, як лічаць супрацоўнікі «Скарбніцы», без прафесіяналаў у галіне маркетынгу яны не могуць разлічваць на поспех, на будучыню, у якой па праву маглі б заняць адведзеную ім лёсам і часам нішу.

Таццяна АНТОНАВА.

ДЭКРЭТ ПРЭЗІДЭНТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ № 11

АБ АСАБЛІВАСЦЯХ СПАГНАННЯ Ў 1998 ГОДЗЕ ПАДАХОДНАГА ПАДАТКУ З СУМ ДАХОДАЎ, ЯКІЯ АТРЫМЛІВАЮЦЬ ЧЛЕНЫ КАЛГАСАЎ, ІНШЫХ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧЫХ КААПЕРАТЫВАЎ, СЯЛЯНСКІХ (ФЕРМЕРСКІХ) ГАСПАДАРАК, РАБОТНІКІ САЎГАСАЎ І ІНШЫХ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧЫХ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ

У мэтах змяншэння ўплыву сезоннага характару сельскагаспадарчай вытворчасці на памер падаходнага падатку, што ўтрымліваецца з даходаў, якія атрымліваюць члены калгасаў, іншых сельскагаспадарчых кааператываў, сялянскіх (фермерскіх), гаспадарак, работнікі саўгасаў і іншых сельскагаспадарчых прадпрыемстваў, і ў адпаведнасці з часткай трэцяй артыкула 101 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь **пастанаўляю:**

1. Устанавіць, што ў адпаведнасці з гэтым Дэкрэтам у 1998 годзе падаходны падатак плацяць:

члены калгасаў, іншых сельскагаспадарчых кааператываў (сельскагаспадарчых фарміраванняў з калектыўнай формай уласнасці, утвораных на базе былых калгасаў), сялянскіх (фермерскіх) гаспадарак і асобы, якія працуюць у іх па працоўных дагаворах, — з даходаў, што выплачваюцца гэтымі калгасамі, кааператывамі і гаспадаркамі;

рабочыя і служачыя саўгасаў і іншых сельскагаспадарчых прадпрыемстваў — з сум заработнай платы, прэмій і любых іншых узнагароджанняў і выплат, якія праводзяць саўгасы і іншыя сельскагаспадарчыя прадпрыемствы, уключаючы даходы, што ўтвараюцца ў выніку прадастаўлення за кошт сродкаў саўгасаў і іншых сельскагаспадарчых прадпрыемстваў сваім работнікам матэрыяльных і сацыяльных даброт.

2. Падаходны падатак з даходаў, названых у абзацах другім і трэцім пункта 1 гэтага Дэкрэта, атрыманых на працягу каляндарнага года, спаганяць зыходзячы з сум мінімальных заработных плат, што склаліся ў разліку за год, у наступных памерах:

Памер	Сума падатку абкладаемага гадавога даходу
Да 240 мінімальных заработных плат	9 працэнтаў
Ад 240 мінімальных заработных плат + 1 рубель да 600 мінімальных заработных плат	21,6 мінімальнай +й платы + 15 працэнтаў з сумы, якая перавышае 240 мінімальных заработных плат
Ад 600 мінімальных заработных плат + 1 рубель да 840 мінімальных заработных плат	75,6 мінімальнай заработнай платы + 20 працэнтаў з сумы, якая перавышае 600 мінімальных заработных плат
Ад 840 мінімальных заработных плат + 1 рубель да 1080 мінімальных заработных плат	123,6 мінімальнай заработнай платы + 25 працэнтаў з сумы, якая перавышае 840 мінімальных заработных плат
Ад 1080 мінімальных заработных плат + 1 рубель да 1320 міні мальных заработных плат	183,6 мінімальнай заработнай платы + 30 працэнтаў з сумы, якая перавышае 1080 мінімальных заработных плат
Ад 1320 мінімальных заработных плат + 1 рубель і вышэй	255,6 мінімальнай заработнай платы + 35 працэнтаў з сумы, якая перавышае 1320 мінімальных заработных плат

Гэты падаходны падатак вылічваецца і ўтрымліваецца калгасамі, іншымі сельскагаспадарчымі кааператывамі (сельскагаспадарчымі фарміраваннямі з калектыўнай формай уласнасці, утворанымі на базе былых калгасаў), сялянскімі (фермерскімі) гаспадаркамі, саўгасамі і іншымі сельскагаспадарчымі прадпрыемствамі штомесяц нарастаючым падрахункам з пачатку каляндарнага года з сумы даходу, зменшанага на даходы і (або) сумы, пералічаныя ў артыкулах 3, 4 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб падаходным падатку з грамадзян», па стаўках, названых у частцы першай гэтага пункта, з залікам раней утрыманай сумы падатку.

3. Не пашыраць у 1998 годзе на членаў калгасаў, іншых сельскагаспадарчых кааператываў (сельскагаспадарчых фарміраванняў з калектыўнай формай уласнасці, утвораных на базе былых калгасаў), сялянскіх (фермерскіх) гаспадарак, работнікаў саўгасаў і іншых сельскагаспадарчых прадпрыемстваў дзеянне главы П Закона Рэспублікі Беларусь «Аб падаходным падатку з грамадзян».

4. Гэты Дэкрэт уступае ў сілу з 1 студзеня 1998 г., з'яўляецца часовым і ў адпаведнасці з часткай трэцяй артыкула 101 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь прадстаўляецца на разгляд Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А.ЛУКАШЭНКА.

28 ліпеня 1998 г., г.Мінск.

ШТО ПАКІНЕМ НАШЫМ ДЗЕЦЯМ?

Стан спраў у лясной гаспадарцы краіны абмяркоўваўся на нарадзе ў прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі 28 ліпеня. Дзейнасць галіны неаднаразова правяралася камісіямі Камітэта дзяржаўнага кантролю рэспублікі і Адміністрацыі Прэзідэнта.

Кіраўнік дзяржавы паведаміў, што на працягу апошніх двух-трох гадоў ён асабіста займаўся вывучэннем сітуацыі ў гэтым народнагаспадарчым комплексе краіны і выказаў нездаволенасць яго работай. Інвестыцыі ад Еўрапейскага эканамічнага супольніцтва і Міжнароднага валютнага фонду ішлі ў першую чаргу ў гэты сектар эканомікі. Аднак, на думку прэзідэнта, вельмі шмат вывозілася з краіны: ад неабразной дошкі да кругляка. Пры гэтым выбіралася самае лепшае.

Аляксандр Лукашэнка не пакінуў без увагі дзейнасць галоўнага ў рэспубліцы экспарцёра прадукцыі лясной гаспадаркі — канцэрна «Беллеспаперапрам». «Прадпрыемства не кантралюе працэс, а пасрэднікі на гэтым нажываюцца», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Ён прапанаваў разабрацца ў «цэнаўтваральным разбоі» і эфектыўна гаспадарыць у лясной гаспадарцы. Прэзідэнт заклікаў работнікаў галіны думаць над тым, як захаваць прыродныя багацці, якія дастануцца нашым дзецям і ўнукам.

Ігар ХОМІЧ, БЕЛТА.

БЕЛАРУСЬ І СТАЎРАПОЛЬСКІ КРАЙ ШУКАЮЦЬ ШЛЯХІ СУПРАЦОЎНІЦТВА

Аб развіцці гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва з Беларуссю маюць намер весці дыялог з кіраўніцтвам нашай краіны прадстаўнікі Стаўрапольскага края.

Дэлегацыю гэтага расійскага рэгіёна, якая прыбыла ў нашу рэспубліку, узначальвае губернатар края Аляксандр Чарнагораў.

Як паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў прэс-службе Міністэрства знешніх эканамічных сувязяў, у ходзе трохдзённага візіту, які праходзіць з 28 па 30 ліпеня, будуць праведзены перагаворы ва ўрадзе краіны, у шэрагу міністэрстваў і ведамстваў, адбудзецца наведванне канцэрна «Белрэсурсы» і агляд арганізаванай тут выстаўкі.

29 ліпеня гасцей з Стаўрапольскага края прыме прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка.

Тэрэза ХАЮЦІНА. БЕЛТА.

ГРУПА КІРАЎНІКОЎ РАСІЙСКІХ РЭГІЁНАЎ НАВЕДАЛА БРЭСТ

Група кіраўнікоў і прадстаўнікоў рэгіёнаў Расійскай Федэрацыі ў саставе 13 чалавек прыбыла 28 ліпеня ў Брэст.

У аэрапорце іх сустракалі прэм'ер-міністр Рэспублікі Беларусь Сяргей Лінг, міністр па справах Садружнасці Незалежных Дзяржаў Валянцін Вялічка, намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Валерый Захарчанка і іншыя кіраўнікі вобласці.

Сярод кіраўнікоў і прадстаўнікоў расійскіх рэгіёнаў, якія прыбылі ў Брэст, — губернатар Краснадарскага края Мікалай Кандраценка, кіраўнік адміністрацыі Уладзімірскай вобласці Мікалай Вінаградаў, кіраўнік адміністрацыі Пскоўскай вобласці Яўген Міхайлаў, кіраўнік адміністрацыі Тульскай вобласці Васіль Старадубцаў, губернатар Яраслаўскай вобласці Анатоль Лісіцын і іншыя.

Адразу ж пасля сустрэчы ў аэрапорце група кіраўнікоў і прадстаўнікоў рэгіёнаў Расійскай Федэрацыі адправілася на экскурсію ў мемарыяльны комплекс «Брэсцкая крэпасць-герой».

Затым госці наведалі мытны пост «Казловічы» і мытны тэрмінал «Брэстгрузаўтасервіс». Закончыўся першы дзень знаходжання расіян на брэсцкай зямлі ў Віскулях, дзе для іх быў арганізаваны прыём ад імя Урада Рэспублікі Беларусь.

29 ліпеня кіраўнікі расійскіх рэгіёнаў наведаюць Белавежскую пушчу. У гэты ж дзень яны вылецяць у Мінск, дзе іх прыме прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка.

Праграма знаходжання ў нашай рэспубліцы расійскіх гасцей прадугледжвае таксама наведванне Віцебскай вобласці і ўдзел у закрыцці Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску»

Людміла КЛАСКОЎСКАЯ, БЕЛТА.

ПРЭЗІДЭНТ ПРАВЯДЗЕ СЕЛЕКТАРНУЮ НАРАДУ

31 ліпеня Аляксандр Лукашэнка правядзе селектарную нараду па пытаннях, звязаных з уборкай ураджаю.

Для нарады будзе выкарыстаны будынак Міністэрства сувязі і інфарматыкі. У селектарнай зале збяруцца члены ўрада, кіраўнікі структур, якія забяспечваюць рытмічную работу ўборачнага канвеера, адказныя работнікі Адміністрацыі прэзідэнта. У абласных цэнтрах у нарадзе прымуць удзел старшыні аблвыканкамаў, кіраўнікі абласных структур; у раённых — старшыні райвыканкамаў, кіраўнікі раённых службаў, гаспадарак.

Як паведамілі БЕЛТА з прэс-службы прэзідэнта, на нарадзе будуць заслуханы справаздачы віцэ-прэм'ера Уладзіміра Гаркуна, некаторых міністраў, старшынь аблвыканкамаў, іншых кіруючых і адказных работнікаў.

Нягледзячы на капрызы прыроды, прагнозы на ўраджай сёлета нядрэнныя. На думку спецыялістаў, ён можа быць не ніжэй за леташні. Аднак уборачная дае збоі. Як паведамілі з прэс-службы кіраўніка дзяржавы, Аляксандр Лукашэнка незадаволены ходам нарыхтоўкі кармоў, пачаткам уборкі збожжавых.

Патрабавальная і дзелавая размова аб тым, што неабходна зрабіць, каб выканаць галоўную задачу дня - своечасова і без страт убраць ураджай, — і пойдзе на селектарнай нарадзе.

БЕЛТА.

ВЁСКА

КАЛГАС ЯК ФОРМА САЦЫЯЛЬНАЙ ПАДТРЫМКІ?

«Так, — адказвае старшыня СКП «Ніва» Віктар Крэс. — Але пры ўмове, калі ёсць за кошт чаго падтрымліваць».

Цяжкі сёлета год для аграрнікаў краіны. Няспынныя дажджы, вадзяныя залівы. Мусіць, рэдкім летам была такая непагадзь. З надвор'я (а з чаго ж яшчэ пачынаць знаёмства?) і пачалася наша гаворка са старшынёй сельскагаспадарчага калектыўнага прадпрыемства «Ніва» Кіраўскага раёна Віктарам Васільевічам Крэсам. З чалавекам, які ўжо амаль два дзесяткі гадоў стаіць за штурвалам, калі гаварыць патэтычна, калгаснага карабля. І зараз Крэс трымае ў памяці той час, калі шэсць гадзін ішоў сход, калі людзі так настойліва не хацелі адпускаць яго папярэдніка. Пытаюся, а ці выступаў тагачасны кандыдат са сваёй «перадвыбарнай платформай».

— Ды не, пра што было гаварыць? І гаспадарку як след не вядаў, і людзей, ды і старшынёю дагэтуль жа не быў. Што ж упустую было абяцаць...

Відаць па ўсім (пра гэта скажуць і людзі ў «Ніве», гэта падкрэсліў у размове і старшыня Кіраўскага райвыканкама Аляксандр Сцяпанчанка), старшыня ў сельскагаспадарчым калектыўным прадпрыемстве, што называецца, на месцы.

Дык чаму ж людзям не быць задаволенымі? Мяркуйце самі. Згодна з дзеючым заканадаўствам, кожны з вясковых жыхароў можа мець прысядзібны ўчастак да 1 гектара. Чаго прасцей — адмерай гэтыя соткі, і няхай кожны сам робіць на іх што заўгодна. Крэс, параіўшыся з праўленнем, спецыялістамі, проста з людзьмі, пайшоў па другому шляху. Прыкладам, у таго альбо іншага гаспадара, як кажуць, каля хаты — 15—20 сотак. Астатнія 80—85, атрымліваецца, павінны быць адмераны ў полі ў агульным калгасным севазвароце. Але мераюць іх толькі на паперы, умоўна. На справе ж канкрэтна нікому соткі не выдзяляюць. А проста ідзе разлік пасяўных плошчаў на прыватныя гаспадаркі. Засаджваючы палі бульбай, у «Ніве» прыкідваюць, што на калгасным полі расце «другі хлеб» і ўсіх прапісаных у вёсках гаспадарк жыхароў — працаздольных калгаснікаў, пенсіянераў, а таксама тых, хто, жывучы на тэрыторыі «Нівы», працуе ў іншых месцах. На кожнага прыпадае да 30 сотак. Астатнія (так, каб разам з бульбяным участкам і прысядзібным кавалачкам атрымаўся той гектар) соткі — пад збожжавыя. Можа быць і пяцьдзесят, і сорак, а ў каго і болей сотак. Самі прыватнікі зямлю тую, што пад бульбу і збожжа ў калгасным полі выдзелена, не апрацоўваюць. Усе затраты — на калгасных плячах.

— А што, думаеце, нашмат эфектыўней было б, калі б кожны бегаў за трактарыстам, соваў яму бутэлькі, адрываў ад грамадскага сектара? — заўважае старшыня.

Як жа ў такім разе вяскоўцы атрымліваюць бульбу, збожжа са свайго гектара? Падлікі досыць простыя. Бярэцца сярэдні ўраджай па гаспадарцы ў цэлым. А пасля памнажаецца на колькасць сотак. Праілюструем на прыкладзе. Летась ураджайнасць бульбы склала 202 цэнтнеры з 1 гектара. Вам нарэзалі 30 сотак. Значыць, на падворак ваш даставяць болей як 60 цэнтнераў. Тое ж самае і па збожжу.

Праўда, тут варта заўважыць, што ўтрыманства ў гаспадарцы не вітаецца. Існуюць і пэўныя стаўкі разліку. Калі соткі выдзелены працуючаму калгасніку, то з атрыманага ім (ці, хутчэй, — выдадзенага для яго) ураджаю пяць працэнтаў адымаецца. У пенсіянера-калгасніка адымаецца дзесяць працэнтаў. У жыхара калгаснай вёскі, які не мае адносінаў да гаспадаркі як работнік, адымаецца трэць. Справядліва? Здаецца, справядліва, і нават вельмі. Да таго ж затраты (тыя пяць — дзесяць працэнтаў і адну трэць) можна скараціць. Якім чынам? Калі ўвесну ў гаспадарку перадаць насенне бульбы, ды і гной таксама, ці лішкі гною, якія не патрэбны на агародзе каля хаты.

Удзяляючы вялікую ўвагу прыватным зацікаўленням калгаснікаў, у «Ніве» спалучылі прыватныя і грамадскія інтарэсы самым цесным чынам. Крэс гэтага не гаварыў, але яно навідавоку, зразумелае і без лішніх слоў. Механізатар, абрабляючы дваццаць ці трыццаць калгасных гектараў, як быццам абрабляе і свае ўласныя бульбяныя соткі. Хто ж хоча зрабіць горш? Вось, атрымліваецца, і маральны фактар у дзеянні. Можна сказаць і інакш: трывалы гаспадарчы фактар.

Да згаданай сацыяльнай справядлівасці ў вырашэнні адвечнага сялянскага пытання пра зямлю можна дадаць і іншыя прыклады. У гаспадарцы скрозь адчуваецца павага да людскіх патрэб. Гэта якраз у «Ніве» танней, мусіць, чым дзе па раёну калгаснікі могуць набыць грэчку, іншыя крупы, муку. Уражанне такое, што старшыня імкнецца кампенсаваць тую розніцу, якая існуе паміж зарплатай селяніна і гараджаніна. Дарэчы, сярэдняя заработная плата ў «Ніве» роўная тром мільёнам рублёў. Да ўсяго астатняга (улічваючы, што запазычанасць па выплаце заработнай платы працаўнікам вёскі складае на сённяшні дзень болей як 800 мільярдаў рублёў па краіне) нельга не заўважыць, што грошы ў гаспадарцы атрымліваюць своечасова. Вось і за чэрвень 7 ліпеня атрымалі.

Так што, здаецца, у «Ніве», дзе бясплатна на зіму выдзяляюць салому, дзе кожны калгаснік мае права на 2 тоны сена, жыць можна. Не трэба тут, як часам здараецца ў пошуках кожнай капейкі, плаціць і за калгасную пашу. Наадварот, работу пастуха статка прыватных кароў аплачвае СКП.

Мо якраз увага да прыватных клопатаў калгаснікаў і ўтрымлівае ў «Ніве» людзей маладых? Між іншым, сярэдні ўзрост працуючых калгаснікаў — 35 гадоў. Пагадзіцеся, таксама паказчык досыць важкі, красамоўны.

Але, і ў гэтым пераконваў і старшыня ў размове, клопат пра людзей магчымы тады, калі ёсць на тое эканамічныя, вытворчыя падставы. У 1997 годзе «Ніва» атрымала з гектара па 34 цэнтнеры збожжавых, бульбы — 202. Надой ад каровы летась быў роўны 3642 кілаграмам. Канешне ж, ёсць гаспадаркі па краіне і з лепшымі паказчыкамі (на жаль, іх нямнога). Але ёсць і раёны, дзе ніводнай гаспадаркі з паказчыкамі на ўзроўні кіраўскай «Нівы».

Мне ўсё ж здаецца, што ўзаемасувязь паміж вытворчымі поспехамі і ўвагай да людзей знаходзіцца і ў адваротнай залежнасці. Будучы з увагай ставіцца да людзей — будуць і адпаведныя вытворчыя паказчыкі.

... А што да надвор'я, то Крэс яшчэ і такую ісціну, жыццём сваім вясковым пацверджаную, выклаў:

— А калі яно было добрае... Калі дождж у пару ішоў? Працаваць трэба з тым надвор'ем, якое дадзена. І што зробіш, на адным губляем, на другім знаходзім. Усяго павінна быць у гаспадарцы патроху...

Алесь КАРЛЮКЕВІЧ.
Кіраўскі раён.

Летняя пара ў вёсцы — гэта гарачы час нарыхтоўкі сена. У вёсцы Любанічы Карэліцкага раёна ў гэтай важнай справе ўдзельнічаюць усе адзінкі жывой і цяглавай сілы.

Фота Максіма МАЛІНОЎСКАГА.

ВАМ АДКАЗВАЕ ЮРЫСТ

ЯК УСТУПІЦЬ У ГАРАЖНА-БУДАЎНІЧЫ КААПЕРАТЫЎ?

Ірына Пятроўна Залеская з Гомеля пражывае з унукам у дзяржаўнай кватэры, у якой пражываюць і іншыя наймальнікі. Нядаўна яе суседка, якая займала пакой 12 м², памерла. Ірыну Пятроўну цікавіць, ці мае яна права замацаваць за сабой вызвалены пакой.

Усё залежыць ад канкрэтных абставінаў. Калі Ірына Пятроўна мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў — яна мае права на гэты пакой.

Такое ж права яна будзе мець і тады, калі не мае патрэбы ў паляпшэнні жыллёвых умоў, але пры ўмове, што ў кватэры няма іншых наймальнікаў, якія таксама маюць патрэбу ў паляпшэнні ўмоў пражывання.

Арт. 54 Жыллёвага кодэкса, які дае такое права, прадугледжвае, што ў гэтым выпадку агульны памер не павінен перавышаць нормы, устаноўленай арт. 46 ЖК (12 м² на аднаго чалавека), а ў выпадках, калі наймальнік ці члены яго сям'і маюць права на дадатковую жылплошчу, таксама нормы дадатковай жылой плошчы.

Дарэчы, калі памер вызваленага ізаляванага пакоя меншы за мінімальны памер, устаноўлены для аднаго чалавека (8 м²), то такі пакой ва ўсіх выпадках прадастаўляецца наймальніку па яго просьбе.

Таму Ірыне Пятроўне абавязкова трэба звярнуцца ў выканкам па месцы жыхарства. Калі ж ёй адмовяць, яна можа аспрэчыць гэта рашэнне выканкама ў суд.

Віктар Кузьмін пражывае ў прыватызаванай кватэры. Ён пытаецца, ці можна гэту кватэру здаць у арэнду камерцыйнай фірме?

Згодна з Жыллёвым кодэксам, жылыя дамы і жылыя памяшканні прызначаны для пастаяннага пражывання грамадзян і грамадзяне павінны выкарыстоўваць іх па прызначэнню. Калі ж жылыя памяшканні выкарыстоўваюцца не па прызначэнню, грамадзяніна могуць прыцягнуць да адміністрацыйнай адказнасці і папярэдзіць ці налажыць штраф.

Загадам Мінжылкамгаса № 123 ад 25.10.1996 года «Аб выкарыстанні прыватызаваных і іншых жылых памяшканняў, якія знаходзяцца ва ўласнасці грамадзян» прадпісана жыллёва-эксплуатацыйным службам сумесна з органамі БТІ правесці тэхнічнае абследаванне жылля, якое знаходзіцца ва ўласнасці грамадзян. У выпадку выяўлення фактаў выкарыстання жылля не па прызначэнню, грамадзяніну будзе зроблена прадпісанне.

Такім чынам, закон забараняе здаваць жылыя памяшканні, няхай нават прыватызаваныя, у арэнду фірмам.

Іван Кіслякоў з Мінска пытаецца, хто мае права на першачарговае ўступленне ў члены гаражна-будаўнічага кааператыва ў г. Мінску і ці захоўваецца за ім чарга ў выпадку смерці льготніка, які стаяў на ўліку?

Пункт 1 Правілаў аб парадку ўліку, фарміравання гаражна-будаўнічых кааператываў і карыстання гаражамі і аўтастаянкамі, зацверджаных рашэннем Мінгарвыканкама ад 5.03.92 г., № 6, гаворыць аб тым, што першачарговае права на ўступленне ў члены гаражна-будаўнічых кааператываў і аўтастаянак прадастаўляецца:

— інвалідам ВАВ, Савецкай Арміі, працы, дзяцінства, агульнага захворвання;
— удзельнікам ВАВ, афганскіх падзей, ліквідацыі наступстваў чарнобыльскай аварыі;
— сем'ям загінуўшых;
— грамадзянам, якія пацярпелі ад рэпрэсій у 20—50-я гады і пасля не былі рэабілітаваныя;
— маці-гераіням.

У выпадку смерці грамадзяніна, які стаяў на ўліку на будаўніцтва гаража (аўтастаянкі), чарга захоўваецца за нашчадкам, які пражываў разам і мае аўтатранспарт.

Таццяна МАТУСЕВІЧ,
адвакат.

ІМЕМ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

ЗАКЛЮЧЭННЕ КАНСТЫТУЦЫЙНАГА СУДА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Аб адпаведнасці Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь частак трэцяй і чацвёртай артыкула 123 Крымінальна-працэсуальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь

Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь у складзе Старшынствуючага — Старшыні Канстытуцыйнага Суда Васілевіча Р. А., суддзяў Бойка Т. С., Вараб'я Г. А., Кеніка К. І., Падгрушы В. В., Саркісавай Э. А., Філіпчык Р. І., Цікавенкі А. Г., Шабайлава В. І., Шукліна В. З., Шышко Г. Б.

з удзелам прадстаўнікоў:

Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь: Хадневіч Т. М. — намесніка старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па нацыянальнай бяспецы; Арлова Л. К. — загадчыка аддзела крымінальнага і адміністрацыйнага заканадаўства ўпраўлення экспертызы законапраектаў Галоўнага экспертна-прававога ўпраўлення Сакратарыята Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь;

Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь: Бурага У. В. — загадчыка аддзела грамадзянскага, сацыяльнага і гаспадарчага заканадаўства экспертна-прававога ўпраўлення Сакратарыята Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Сянюты Л. Я. — галоўнага спецыяліста экспертна—прававога ўпраўлення Сакратарыята Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь;

эксперта Кукрэш Л. І. — дацэнта кафедры крымінальнага працэсу Акадэміі МУС Рэспублікі Беларусь, кандыдата юрыдычных навук

разгледзеў у адкрытым судовым пасяджэнні справу «Аб адпаведнасці Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь частак трэцяй і чацвёртай артыкула 123 Крымінальна—працэсуальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь».

У судовым пасяджэнні прынялі ўдзел: Пташнік У. М. — намеснік Старшыні Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь; Ягораў А. П. — намеснік Старшыні Вышэйшага Гаспадарчага Суда Рэспублікі Беларусь; Бажэлка А. А. — Генеральны пракурор Рэспублікі Беларусь.

Вядзенне па справе ўзбуджана Канстытуцыйным Судом 25 мая 1998 года па прапанове Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь на падставе артыкула 116 Канстытуцыі, артыкулаў 5 і 6 Закона «Аб Канстытуцыйным Судзе Рэспублікі Беларусь» і артыкула 43 Рэгламенту Канстытуцыйнага Суда.

Праверцы падлягалі часткі трэцяя і чацвёртая артыкула 123 Крымінальна—працэсуальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь.

Згодна з часткай трэцяй артыкула 123 Крымінальна—працэсуальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь (у далейшым КПК) па справах аб злачынствах, прадугледжаных артыкуламі 68, 71, 74, 74^{1}, 77—79, 82, 100—105, 114—118, 122, 122^{1}, 124—127, 128, 130—140, 149, 149^{2}, 158, 159, 166—176, 184^{4}, 186^{2}, 186^{3}, 187—189^{1}, 194^{2}, 198, 208^{2}, 209—211, 216—218, 219^{4} часткай другой, 222, 227—247, 248 пунктамі «г» і «д», 249—258 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, папярэдняе следства праводзіцца следчымі органаў пракуратуры, а па справах аб злачынствах, прадугледжаных артыкуламі 61—67, 69, 72, 73, 73^{1}, 75, 76, 80, 81, 248 пунктамі «а», «б» і «в» Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, — таксама следчымі органаў дзяржаўнай бяспекі.

У адпаведнасці з часткай чацвёртай артыкула 123 КПК па справах аб злачынствах, прадугледжаных артыкуламі 83, 84, 84^{1}, 84^{2}, 85^{1}, 85^{2}, 87—90, 92, 92^{2}, 93, 96 часткай другой, 97, 98, 106—109, 111, 112, 112^{1}, 113 часткамі другой, трэцяй і чацвёртай, 113^{1}, 119, 123, 150^{1}—150^{6}, 151 часткай другой, 151^{3}—152^{4}, 153 часткай другой, 154, 157, 160 часткай другой, 162, 181^{1}, 184, 184^{1}, 184^{3}, 190—192, 197^{1}, 201 часткай трэцяй, 202, 203 часткай другой, 205—206, 206^{2}, 206^{3}, 207^{2} часткамі другой і трэцяй, 208, 208^{1}, 211^{1}—211^{5}, 212—215, 219—219^{3}, 219^{4} часткай першай, 219^{5}—219^{7}, 220—221, 223—225 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, па ўсіх справах аб злачынствах, учыненых непаўналетнімі, папярэдняе следства праводзіцца таксама следчымі органаў унутраных спраў.

З просьбай аб унясенні ў Канстытуцыйны Суд прапановы аб праверцы канстытуцыйнасці ўказаных частак артыкула 123 КПК звярнуўся да Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Генеральны пракурор Рэспублікі Беларусь. У сваім звароце ён, у прыватнасці, указаў, што часткай чацвёртай артыкула 123 КПК устаноўлена, што па ўсіх справах аб злачынствах, учыненых непаўналетнімі, папярэдняе следства праводзіцца таксама следчымі органаў унутраных спраў. У гэтай частцы артыкула падследнасць вызначана не ў залежнасці ад санкцыі артыкула, а ў залежнасці ад асобы, якая ўчыніла злачынства. З гэтага вынікае, што закон па ўсіх катэгорыях крымінальных спраў аб злачынствах, учыненых непаўналетнімі, прадугледжвае іх расследаванне і следчымі органаў унутраных спраў, што пацвярджаецца шматгадовай судовай практыкай. Разам з тым Пленум Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь, выносячы пастанову па канкрэтнай справе аб злачынствах, прадугледжаных артыкуламі 74 і 100 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, ва ўчыненні якіх сумесна з асобамі, дасягнуўшымі 18-гадовага ўзросту, удзельнічалі і трое непаўналетніх, указаў, што правядзенне следства па дадзенай справе следчым органаў унутраных спраў з'яўляецца істотным парушэннем крымінальна-працэсуальнага закона. Пленум Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь указаў, у прыватнасці, што справы аб злачынствах, кваліфікаваных артыкуламі 74 і 100 Крымінальнага кодэкса, санкцыямі якіх прадугледжана выключная мера пакарання, падследныя толькі органам пракуратуры.

Такое тлумачэнне артыкула 123 КПК, па меркаванню Генеральнага пракурора, ставіць пад сумненне канстытуцыйнасць гэтай нормы, з'яўляецца памылковым па сутнасці, супярэчыць сэнсу трэцяй і чацвёртай частак артыкула 123 КПК і, акрамя таго, дадзена ў парушэнне Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.

Заслухаўшы суддзю-дакладчыка Саркісаву Э. А., прадстаўнікоў боку, эксперта, прааналізаваўшы палажэнні Канстытуцыі, Крымінальна-працэсуальнага кодэкса і іншых законаў Рэспублікі Беларусь, міжнародна-прававых актаў, вывучыўшы матэрыялы справы, следчую і судовую практыку, Канстытуцыйны Суд устанавіў наступнае.

У адпаведнасці з артыкулам 122 КПК папярэдняе следства па крымінальных справах праводзіцца следчымі пракуратуры, а таксама следчымі органаў унутраных спраў і следчымі органаў дзяржаўнай бяспекі.

У артыкуле 123 КПК рэгламентуецца абавязковасць папярэдняга следства і падследнасць. Пры вызначэнні падследнасці ў частках трэцяй і чацвёртай артыкула 123 КПК выкарыстаны 2 крытэрыі: від злачынства (прадметная падследнасць) і прыкметы суб'екта злачынства (персанальная падследнасць).

Вызначыўшы канкрэтныя катэгорыі злачынстваў, крымінальныя справы аб якіх падследныя органам пракуратуры, органам дзяржаўнай бяспекі або органам унутраных спраў, закон прадаставіў права следчым органаў унутраных спраў таксама праводзіць папярэдняе следства па ўсіх крымінальных справах аб злачынствах, учыненых непаўналетнімі.

Прааналізаваўшы развіццё крымінальна—працэсуальнага заканадаўства, якое прадугледжвае падследнасць крымінальных спраў, Канстытуцыйны Суд устанавіў, што да 1978 года вядзенне папярэдняга следства па ўсіх справах аб злачынствах, учыненых непаўналетнімі, было аднесена да кампетэнцыі следчых органаў пракуратуры. Аднак указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета рэспублікі ад 11 мая 1978 г. (ЗЗ БССР, 1978, № 14, арт. 269), унёсшым змяненні ў часткі трэцюю і чацвёртую артыкула 123 КПК, права вядзення папярэдняга следства па ўсіх справах аб злачынствах, учыненых непаўналетнімі, было прадастаўлена таксама следчым органаў унутраных спраў. Такое пашырэнне падследнасці органаў унутраных спраў тлумачылася тым, што гэтыя органы, маючы ў сваім складзе інспекцыі па справах непаўналетніх, а таксама валодаючы магчымасцямі забеспячэння комплекснага падыходу да прафілактыкі злачыннасці сярод непаўналетніх, маглі на якасным узроўні праводзіць і расследаванне дадзенай катэгорыі крымінальных спраў. Разам з тым указаная падследнасць органаў унутраных спраў крымінальна-працэсуальным заканадаўствам не прызнавалася выключнай. Такія справы мелі права расследаваць і органы пракуратуры, а таксама органы дзяржаўнай бяспекі.

Ацаніўшы змест артыкула 123 КПК у дзеючай рэдакцыі, Кастытуцыйны Суд адзначае, што органы ўнутраных спраў і пракуратуры як органы дзяржавы заклікаы пры ажыццяўленні сваіх функцый ахоўваць правы і свабоды асобы, што непасрэдна замацавана ў Канстытуцыі і законах, якія рэгулююць дзейнасць гэтых органаў.

Артыкулам 7 Канстытуцыі прадугледжана, што дзяржава, усе яе органы і службовыя асобы дзейнічаюць ў межах Канстытуцыі і прынятых у адпаведнасці з ёю актаў заканадаўства.

Згодна з артыкулам 59 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь дзяржаўныя органы, службовыя і іншыя асобы, якім даверана выкананне дзяржаўных функцый, абавязаны ў межах сваёй кампетэнцыі прымаць неабходныя меры для ажыццяўлення і абароны правоў і свабод асобы. Гэтыя органы і асобы нясуць адказнасць за дзеянні, якія парушаюць правы і свабоды асобы.

У адпаведнасці з артыкулам 2 Закона «Аб Пракуратуры Рэспублікі Беларусь» органы пракуратуры поруч з іншымі функцыямі ажыццяўляюць таксама расследаванне злачынстваў. У артыкуле 5 дадзенага Закона ўказваецца, што пры ажыццяўленні сваёй дзейнасці пракурорскія работнікі забяспечваюць захаванне гарантаваных дзяржавай правоў і свабод асобы незалежна ад грамадзянства, сацыяльнага і маёмаснага становішча, расавай і нацыянальнай прыналежнасці, мовы, полу, узросту, адукацыі, адносін да рэлігіі, палітычных і іншых перакананняў.

Палажэннем аб Міністэрстве ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь на органы ўнутраных спраў ускладзена вядзенне папярэдняга следства ў межах іх кампетэнцыі. Згодна з артыкулам 6 Закона «Аб міліцыі» міліцыя абараняе кожнага чалавека незалежна ад яго грамадзянства, сацыяльнага, маёмаснага і іншага становішча, расавай і нацыянальнай прыналежнасці, мовы, полу, узросту, адукацыі, адносін да рэлігіі, палітычных і іншых перакананняў.

Законам Рэспублікі Беларусь «Аб правах дзіцяці» і Канвенцыяй «Аб правах дзіцяці», ратыфікаванай Рэспублікай Беларусь 28 ліпеня 1990 г., на органы дзяржавы ўскладаецца абавязак абароны правоў і інтарэсаў непаўналетніх. Такая абарона павінна забяспечвацца і ў працэсе расследавання крымінальных спраў аб злачынствах, учыненых непаўналетнімі, як следчымі органаў пракуратуры, так і следчымі органаў унутраных спраў. Прававой гарантыяй роўнай абароны правоў непаўналетніх, якія абвінавачваюцца ва ўчыненні злачынстваў, забеспячэння аб'ектыўнага і ўсебаковага даследавання і вырашэння справы, незалежна ад органа, які яе расследаваў, з'яўляецца прадугледжаная артыкулам 49 КПК магчымасць допуску абаронцы да ўдзелу ў справе ўжо з моманту прад'яўлення абвінавачання.

Канстытуцыйны Суд лічыць, што прадастаўленне органам унутраных спраў права праводзіць папярэдняе следства па ўсіх справах аб злачынствах, учыненых непаўналетнімі, не супярэчыць Канстытуцыі і не парушае правоў і законных інтарэсаў грамадзян.

У адпаведнасці з артыкулам 11 Закона «Аб Канстытуцыйным Судзе Рэспублікі Беларусь» пры праверцы акта Канстытуцыйны Суд мае на ўвазе як літаральны яго сэнс, так і сэнс, які надаецца яму практыкай прымянення.

Канстытуцыйны Суд, вывучыўшы практыку прымянення частак трэцяй і чацвёртай артыкула 123 КПК, адзначае, што на працягу доўгага часу як следчая, так і судовая практыка Рэспублікі Беларусь фарміравалася зыходзячы з разумення таго, што органы ўнутраных спраў маглі праводзіць папярэдняе следства як па крымінальных справах аб усіх злачынствах, учыненых толькі непаўналетнімі, так і па справах аб злачынствах, учыненых непаўналетнімі ў саўдзеле з асобамі, якія дасягнулі 18-гадовага ўзросту. Папярэдняе следства па крымінальных справах аб злачынствах, учыненых непаўналетнімі, у тым ліку і ў саўдзеле з асобамі, якія дасягнулі 18-гадовага ўзросту, на практыцы праводзілася і следчымі органаў пракуратуры, паколькі закон не выключае права расследавання такіх спраў гэтымі органамі. Суды на працягу многіх гадоў разглядалі крымінальныя справы аб злачынствах, учыненых непаўналетнімі або з іх удзелам, расследаваныя следчымі органаў унутраных спраў, не вяртаючы іх у сувязі з гэтым на дадатковае расследаванне па матывах істотнага парушэння крымінальна-працэсуальнага закона. Аднак Пленум Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь сваёй пастановай ад 19 чэрвеня 1997 г. па канкрэтнай справе поруч з іншымі падставамі для накіравання справы на дадатковае расследаванне ўказаў, у прыватнасці, што «папярэдняе расследаванне па справе ў парушэнне патрабаванняў ч. 3 арт. 123 КПК было праведзена не следчым пракуратуры, а следчым органаў унутраных спраў, што з'яўляецца істотным парушэннем норм крымінальна—працэсуальнага закона, таму што справы аб злачынствах, кваліфікаваных па арт. арт. 74, 100 КК, санкцыямі якіх прадугледжана выключная мера пакарання, падследныя толькі органам пракуратуры» (Судовы веснік, 1997, № 3, с. 25).

Канстытуцыйны Суд у сувязі з гэтым адзначае, што спрэчка аб падследнасці крымінальных спраў аб злачынствах, учыненых непаўналетнімі ў саўдзеле з асобамі, якія дасягнулі 18-гадовага ўзросту, магла ўзнікнуць з прычыны неадназначнага разумення ў тэорыі і на практыцы зместу частак трэцяй і чацвёртай артыкула 123 КПК, выкарыстоўваючых розныя крытэрыі вызначэння падследнасці, іх супярэчнасці і недастаткова дакладнай рэдакцыі. Пленум Вярхоўнага Суда ў сваёй пастанове ад 19 чэрвеня 1997 г., вынесенай па канкрэтнай справе, пры абгрунтаванні істотнага парушэння норм крымінальна-працэсуальнага закона, допушчанага пры расследаванні гэтай справы, фактычна даў такое тлумачэнне закона, якое змяніла падыход да разумення сэнсу частак трэцяй і чацвёртай артыкула 123 КПК. У прыватнасці, ва ўказаным артыкуле адсутнічае такі крытэрый аднясення крымінальных спраў да выключнай падследнасці органаў пракуратуры, як санкцыя крымінальнага закона ў выглядзе пакарання смерцю, паколькі ў частцы трэцяй гэтага артыкула прадугледжана падследнасць крымінальных спраў органам пракуратуры ў залежнасці ад віду злачынства (прадметная падследнасць). Не адпавядае сэнсу ўказаных норм і растлумачэнне Пленума Вярхоўнага Суда аб тым, што справы аб злачынствах, кваліфікаваных па артыкулах 74, 100 КК, падследныя толькі органам пракуратуры. Зыходзячы з аналізу часткі чацвёртай артыкула 123 КПК можна зрабіць адназначны вывад, што справы аб такіх злачынствах могуць быць падследныя і органам унутраных спраў у выпадках, калі яны ўчыняюцца толькі непаўналетнімі.

Згодна з артыкулам 125 Канстытуцыі пракуратура ажыццяўляе нагляд за выкананнем законаў пры расследаванні злачынстваў. Ажыццяўляючы наглядную функцыю, пракурор у адпаведнасці з пунктам 9 артыкула 211 КПК у мэтах забеспячэння найбольш поўнага і аб'ектыўнага расследавання мае права перадаць справу ад аднаго органа папярэдняга следства другому. Згодна з артыкулам 212 КПК указанні пракурора органам дазнання і папярэдняга следства ў сувязі з узбуджэннем і расследаваннем імі крымінальных спраў, дадзеныя ў парадку, прадугледжаным Крымінальна-працэсуальным кодэксам, з'яўляюцца для гэтых органаў абавязковымі. З указаных норм КПК вынікае, што пракурору належыць і права прыняцця рашэння аб падследнасці крымінальнай справы аб злачынствах, падследных розным органам. Такі падыход замацаваны ў частцы сёмай артыкула 234 Мадэльнага крымінальна-працэсуальнага кодэкса, прынятага Міжпарламенцкай Асамблеяй дзяржаў—удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў 17 лютага 1996 г.

У перыяд вядзення па гэтай справе з мэтай заканадаўчага замацавання парадку і падстаў размежавання падследнасці па складаных, шматэпізодных справах аб злачынствах, падследных розным органам папярэдняга следства, Законам ад 9 ліпеня 1998 г. «Аб унясенні дапаўнення і змяненняў у Крымінальна—працэсуальны кодэкс Рэспублікі Беларусь» артыкул 123 КПК дапоўнены новай часткай наступнага зместу: «Пры злучэнні ў адным вядзенні спраў, падследных розным органам папярэдняга следства або дазнання, а таксама калі ў ходзе расследавання будуць выяўлены злачынствы, справы аб якіх адносяцца да падследнасці іншых органаў папярэдняга следства або дазнання, падследнасць вызначаецца пракурорам».

У сувязі з гэтым Канстытуцыйны Суд лічыць, што права на прыняцце рашэнняў аб падследнасці крымінальных спраў належыць органам пракуратуры ў межах іх кампетэнцыі і што прымаемыя органамі пракуратуры рашэнні аб перадачы органам унутраных спраў для расследавання крымінальных спраў аб злачынствах, указаных у частцы трэцяй артыкула 123 КПК, учыненых у саўдзеле з непаўналетнімі, не супярэчаць сэнсу закона.

На падставе выкладзенага і кіруючыся артыкулам 116 Канстытуцыі, артыкуламі 5, 6, 34, 38, 40 і 43 Закона «Аб Канстытуцыйным Судзе Рэспублікі Беларусь», Канстытуцыйны Суд

ВЫРАШЫЎ:

1. Прызнаць адпаведнымі Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь часткі трэцюю і чацвёртую артыкула 123 Крымінальна—працэсуальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, маючы на ўвазе, што органы ўнутраных спраў, як і органы пракуратуры, маюць права праводзіць папярэдняе следства па крымінальных справах аб злачынствах, учыненых непаўналетнімі, а таксама, што крымінальна—працэсуальны закон не выключае магчымасці прыняцця органамі пракуратуры ў межах іх кампетэнцыі рашэнняў аб перадачы для расследавання следчым органаў унутраных спраў крымінальных спраў аб злачынствах, прадугледжаных у частцы трэцяй артыкула 123 Крымінальна—працэсуальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, учыненых непаўналетнімі або ў саўдзеле з імі.

2. Апублікаваць гэта Заключэнне ў дзесяцідзённы тэрмін з дня прыняцця ў «Народнай газеце» і «Звяздзе», а таксама ў «Ведамасцях Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь».

3. Гэта Заключэнне ўступае ў сілу з дня абвяшчэння, з'яўляецца канчатковым, абскарджанню і апратэставанню не падлягае.

Старшынствуючы — Старшыня Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь Р. А. ВАСІЛЕВІЧ.

14 ліпеня 1998 г., г. Мінск
№ 3—69/98

ПРАВІНЦЫЯ

ГАСПАДАРУ ФОРТА НЯМА ЧАСУ СТАРЭЦЬ

Кажуць, што жыхары Бабруйшчыны — гэта нейкая асаблівая мінінацыя, якая ўзнікла на скрыжаванні адразу трох культур: беларускай, расійскай і яўрэйскай. Кажуць таксама, што прадстаўнікі гэтай мінінацыі здольныя па сваёй натуры ў тым ліку і на ўсякія авантурныя ўчынкі, мноства з якіх мае якраз паспяховы вынік. Гэтую выснову пацвярджаюць нямала фактаў, і гэты — адзін з цэлага шэрагу...

Віктару Іванавічу Міхалапу нядаўна споўнілася 60 гадоў. Родам ён з вёскі Клічаўскага раёна, што за некалькі дзесяткаў кіламетраў ад самога Бабруйска. Так здарылася, што ў 1942 годзе бацька Віктара Іванавіча загінуў, і маці засталася ў вайну з чатырма дзецьмі на руках — малодшай «ляльцы» быў толькі год, а старэйшай сястры — шэсць гадоў. Мужная жанчына лёсу свайму цяжкаму не скарылася, а неверагоднымі высілкамі, у страшэнна бедны час здолела ўсіх дзяцей паставіць на ногі і даць адукацыю. Віктар Іванавіч Міхалап лічыць, што не толькі цвёрдасць духу, але і прадпрымальнасць (без чаго таксама выгадаваць малых адзінокай жанчыне было б немагчыма) ён атрымаў у спадчыну ад сваёй маці.

Прынцыпова, біяграфія ў нашага героя самая звычайная. Пасля навучання ў сталічным радыётэхнічным інстытуце ён прыехаў у Бабруйск і пачаў стандартны працоўны шлях на Беларускім шынным камбінаце, прайшоў амаль усе прыступкі кар'ернай лесвіцы на «Белшыне» да пасады галоўнага прыбарыста. Потым, калі пайшла «хваля» прадпрымальніцтва, Віктар Іванавіч Міхалап адкрыў сваё малое прадпрыемства, дзе рабілі рамонт аўтамабільных шын на аснове асабістага вынаходніцтва. Спачатку, шчыра расказаў цяпер былы дырэктар МП Міхалап, справы ішлі зусім нядрэнна, а потым, у пік крызісу, ужо ні новыя шыны не мелі збыту, ні заказаў на рамонт старых не стала. Малое прадпрыемства абанкруцілася і спыніла сваю дзейнасць. А вось гаспадаром форта Бабруйскай крэпасці Віктар Іванавіч стаў яшчэ на пачатку 90-х, калі справы па рамонту шын ішлі няблага, і кіраўнік задумваўся над пашырэннем вытворчых плошчаў.

Трэба адразу сказаць, што форт — гэта зусім не палац, таксама ён не падобны на ніякае іншае казачна-велічнае старажытнае збудаванне. Адна толькі праўда, што старажытнае: у дакументах на валоданне фортам стаіць дакладная дата — 1868 год! Віктар Іванавіч даведаўся пра намер начальніка вайсковай часці, якой гэты форт належаў, разбурыць і знішчыць непрыгодную старую пабудову, цалкам выпадкова: ваенныя здавалі ў рамонт шыны, у звычайнай свецкай гутарцы і распавялі пра навіну ў жыцці часці. Тады Міхалап сказаў начальніку: «Навошта разбураць? Давайце я яго набуду ў вас за грошы!» Гэтыя падзеі адбываліся напрыканцы 1991 года...

Сённяшні гаспадар форта ўспамінае, што калі ўпершыню ўбачыў сваю будучую ўласнасць, адразу адчуў нейкае хваляванне — ад таго, што дакрануўся да даўніны, і падумаў, што разбураць яе будзе няправільна. Але ў той жа час, як чалавек прагматычны, ён адразу падлічыў, што памяшканняў для майстэрні пасля рамонту хопіць, так што можна купляць!

На афармленне ўсіх неабходных для куплі дакументаў спатрэбілася не вельмі шмат часу — усяго паўгода. Каштаваў гэты форт нямала: амаль мільён рублёў у 1991 годзе. Каб заплаціць усе грошы, Міхалап сабраў усё, што адкладаў «на чорны дзень», прадаў аўтамабіль, гараж у прэстыжным раёне і ўласны трактар «МТ-50». Больш за ўсіх была незадаволеная «прыгожая палавіна» сям'і Міхалапаў: жонка Віктара Іванавіча не ацаніла станоўча даволі авантурны ўчынак Віктара Іванавіча і ад думкі сваёй не адступаецца і зараз, бо і дасюль невядома дакладна — ці будзе толк ад гэтага форта, ці, як мяркуюць скептыкі, усё ж такі не.

Грошы на гэтым у Віктара Іванавіча ўсе скончыліся, а таму і рамонт цягнецца столькі гадоў — усё прыходзіцца рабіць сваімі сіламі. Сілы гэтыя складаюцца з самога гаспадара, ягонага швагра-пенсіянера Уладзіміра Іванавіча Сазанаўца і сына гаспадара Андрэя, які, як і бацька, скончыў радыётэхнічны інстытут, але пакуль не знайшоў сабе працоўнага месца. Уся брыгада паспяхова асвоіла ўсе магчымыя будаўнічыя прафесіі і, натуральна, спадзяецца, што потым, калі скончыцца рамонт, працаваць далей у форце на новай шынамайстэрні — запас рацыяналізатарскіх вынаходніцтваў у Віктара Іванавіча яшчэ не скончыўся.

Праўда, падказваюць з боку і іншыя ідэі. Напрыклад, адкрыць у форце рэстарацыю. Ну пагадзіцеся, чым не экзотыка?! Але гаспадар не жадае рабіць тут грамадскую ўстанову: не хоча, каб ездзілі сюды ўсякія там «крутыя», а потым бегаць вакол іх. Майстэрні — гэта спакайней, без п'янак, і, як гаворыць Міхалап, «каб пастарыкоўску ні ад кога не залежаць».

Сёння стары форт ужо выглядае не разбураным, а амаль што прыстасаваным для майстэрні, калі б не кучы будаўнічых матэрыялаў і смецця ў двары. Але страшна нават успамінаць, у якім выглядзе ён прыняў набытую ўласнасць. «Тут жа нічога жывога не было!» — хваляваўся гаспадар.

Віктар Іванавіч расказаў, што, калі адбывалася здзелка куплі-продажу, грамадзянскія ўлады Бабруйска пра яе не ведалі, таму што форт быў часткай ваеннай маёмасці. Потым нехта прачуў пра незвычайную падзею, і газета «Бабруйскае жыццё» гэты факт адкаменціравала ў адмоўным сэнсе: маўляў, расцягваюць народнае багацце. «А што гэта народнае багацце, нікому не патрэбнае, разбуралася сабе патроху, гэтым тады ніхто не пацікавіўся», — трохі з крыўдай успамінае гаспадар. І гэтым людзі не абмежаваліся: хтосьці ў дадатак праявіў пільнасць і напісаў скаргу «ў органы» на дырэктара малога прадпрыемства, які выгаргаваў сабе гістарычны будынак. Правяраючыя, успамінае Віктар Іванавіч, калі паглядзелі на руіны форта, за галаву схапіліся: «Што ж гэты няшчасны чалавек будзе рабіць з гэткай развалінай?» І праўда, з сямі пакояў у форце застаўся толькі адзін. І калі б не знайшоўся на яго гаспадар, адным фортам у старажытнай Бабруйскай крэпасці зараз было б меней...

Яшчэ ў 1991 годзе бабруйскія архітэктары аўтарытэтна заявілі, што гістарычнай каштоўнасці гэты форт не мае. Потым рамонт форта спецыялісты ўсё ж такі інспектавалі і, каб не псаваць выгляд вуліцы Кірава ў мікрараёне пад назвай «Фарштат», настойліва раілі гаспадару падмаляваць новую цагляную кладку.

Дарэчы, кожнаму, хто ўпершыню прыязджае ў Бабруйск, карэнныя гараджане (яны звычайна — патрыёты роднага горада) з ахвотай пакажуць тое, што засталося ад знакамітай ваеннай крэпасці. Некаторыя яе пабудовы цёмна-чырвонага колеру яшчэ нядрэнна захаваліся да нашых дзён. А таксама вам абавязкова раскажуць пра існаваўшы калісьці падземны ход — такі вялізны, што паміж фортамі па ім маглі праязджаць коннікі. Таму мы адразу спыталі Віктара Іванавіча пра гэты ход: ці знайшоў ён яго? Аказалася, не знайшоў. Аднак усё ж пэўная верагоднасць застаецца: новая падлога зроблена ў пяці памяшканнях з сямі. Ды і, шчыра прызнаўся гаспадар форта, то падземным ходам не вельмі цікавіцца: ён у любым выпадку настолькі разбурыўся з цягам часу, што выкарыстоўваць яго па-прадпрымальніцку не выпадае. А шкада!

А цяпер настаў час, калі грамадскасць і ўлады сталі зноў цікавіцца амаль цалкам адрамантаваным фортам і ягоным гаспадаром. Віктар Іванавіч так і сустрэў гасцей-журналістаў словамі: «Толькі не наклічце на мяне бяду!» І ў адказ на наша неўразуменне сумна сказаў: «А калі захочуць адабраць?..» Што ж, савецкі чалавек не па чутках ведае, што такое «нацыяналізацыя» і «экспрапрыяцыя», таму і баіцца.

Будзем спадзявацца, што страхі пенсіянера-ўласніка форта цалкам дарэмныя. Яго і самога суцяшае яшчэ і той факт, што ён не адзіны ў Бабруйску ўладальнік часткі крэпасці: ёсць і іншы «прыватнік», валодае буйной часткай на выездзе з горада ў бок абласнога цэнтра, і, па некаторых звестках, збіраецца там адкрыць матэль з усім комплексам паслуг для нябеднага вандроўніка. Ёсць і яшчэ некалькі кінутых і занядбаных фортаў, якімі пакуль ніхто не зацікавіўся... А вось форт Міхалапа дзякуючы клопатам новага гаспадара будзе стаяць яшчэ доўгія гады і служыць людзям. «Я тут не вечны, — кажа Віктар Іванавіч, — і ў магілу з сабой нічога не забяру. І чый бы гэты форт ні быў — мой ці не — ён цяпер будзе стаяць як старажытнае ўпрыгажэнне нашага горада».

Трэба адзначыць, што жыццё ў гаспадара форта абсалютна не казачнае. Амаль уся пенсія ідзе на будаўнічыя матэрыялы. Жыве Віктар Іванавіч у іншым мікрараёне, прыязджае кожны дзень на сваю будоўлю ў восем гадзін раніцы на грамадскім транспарце і працуе ў летні час па дванаццаць гадзін. Акрамя выхадных, бо па патрабаванню жонкі і па свайму разуменню некалькі дзён на тыдні ён павінен аддаць сельскай гаспадарцы — ёсці ж трэба!

Па прычыне школьных канікулаў мы не пабачылі ў форце звычайных «наглядальнікаў» за працай брыгады Міхалапа — дзяцей, якія жывуць навокал. Яны просяць у Міхаіла Іванавіча дазволу залезці на невысокі дах форта і там пагуляць, ну і, канешне, ніхто хлапчукам у гэтым не адмаўляе. Суседзі-дарослыя таксама прыхільна ставяцца да гаспадара форта, але вельмі ўжо часта ў госці сюды не прыходзяць, бо, напэўна, ведаюць ці адчуваюць, што Віктар Іванавіч любіць спакой.

Так, многія адкрыта, без лішняй сціпласці гавораць Віктару Іванавічу Міхалапу, што прыйшоў час яму адпачыць. Пенсіянер усё ж такі! Значыць, павінен сядзець на лаўцы, гутарыць з іншымі пенсіянерамі пра надвор'е, цэны і пра дрэнную па цяперашнім часе моладзь, а калі-нікалі ў цесным мужчынскім коле «меркаваць» на алкагольную тэму ў адпаведнасці з існуючай народнай традыцыяй «расслаблення».

А пенсіянер Міхалап так жыць не хоча. Гаворыць, што не здолее нічога не рабіць, бо гэта вельмі сумна. Ён вывеў сваю формулу доўгажыхарства, паводле якой цікавасць да жыцця не дае чалавеку старэць.

— Мы ўвесь час здзіўляемся, чаму творчыя людзі звычайна жывуць доўга, — дзеліцца сваім рэцэптам нестарэння Віктар Іванавіч. — Таму што яны занятыя сваімі ідэямі, ім проста няма часу старэць. У іх ёсць цікавасць да жыцця, а гэта і ёсць самае галоўнае! Нашы ідэі, наш творчы неспакой падаўжаюць нам жыццё, я ў гэтым упэўнены. А вось калі ты сеў і супакоіўся — гэта значыць усё, канец...

Ілона ІВАНОВА.
Фота Аляксандра ЛІЦІНА.
г. Бабруйск.

ЗАКОН РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
АБ УНЯСЕННІ ДАПАЎНЕННЯ І ЗМЯНЕННЯ Ў КРЫМІНАЛЬНА-ПРАЦЭСУАЛЬНЫ КОДЭКС РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Прыняты Палатай прадстаўнікоў 18 чэрвеня 1998 года
Адобраны Саветам Рэспублікі 29 чэрвеня 1998 года

Артыкул 1. Унесці ў Крымінальна-працэсуальны кодэкс Рэспублікі Беларусь, зацверджаны Законам Рэспублікі Беларусь ад 29 снежня 1960 года (ЗЗ БССР, 1961 г., № 1, арт.5; Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, 1994 г., № 12, арт.176), наступныя дапаўненне і змяненне:

1. Артыкул 123 дапоўніць новай часткай наступнага зместу:

«Пры злучэнні ў адным вядзенні спраў, падследных розным органам папярэдняга следства або дазнання, а таксама калі ў ходзе расследавання будуць выяўлены злачынствы, справы аб якіх адносяцца да падследнасці іншых органаў папярэдняга следства або дазнання, падследнасць вызначаецца пракурорам».

2. Артыкул 126 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«Артыкул 126. Злучэнне і выдзяленне крымінальных спраў

Могуць быць злучаны ў адным вядзенні толькі справы па абвінавачанню некалькіх асоб у саўдзеле ва ўчыненні аднаго або некалькіх злачынстваў або справы па абвінавачванню адной асобы ва ўчыненні некалькіх злачынстваў, а таксама ў загадзя не абяцаным укрывальніцтве гэтых жа злачынстваў і неданясенні аб іх.

Справа можа быць выдзелена ў асобнае вядзенне, калі ў выніку папярэдняга следства або дазнання ўстаноўлена адсутнасць сувязі паміж асобнымі злачынствамі ці асобамі, якія іх учынілі, матэрыялы аб якіх ёсць у адной вытворчасці, а таксама ў іншых выпадках, што выклікаюцца неабходнасцю.

Злучэнне і выдзяленне спраў праводзіцца па пастанове следчага, органа дазнання або пракурора.

Па справах аб некалькіх злачынствах з улікам месцаў учынення асобных злачынстваў, складанасці і працаёмкасці расследавання пракурор, а таксама следчы, орган дазнання са згоды пракурора, прызнаўшы сабраныя доказы ў адносінах да асобы па абвінавачванню ва ўчыненні асобных злачынстваў дастатковымі для накіравання справы ў суд, маюць права вынесці матываваную пастанову аб выдзяленні справы, прыняць меры да заканчэння па ёй правядзення папярэдняга следства або дазнання і накіравання ў суд па гэтаму абвінавачванню.

Выдзяленне справы дапускаецца пры ўмове, што гэта істотна не адаб'ецца на ўсебаковасці, паўнаце і аб'ектыўнасці расследавання і вырашэння справы».

Артыкул 2. Гэты Закон уступае ў сілу з дня яго апублікавання.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. ЛУКАШЭНКА.

9 ліпеня 1998 г., г. Мінск. №183-З

ГРАМАДЗЯНКА БЕЛАРУСІ АДСЕДЗЕЛА ПАЎГОДА Ў ЛІТОЎСКАЙ ТУРМЕ

Грамадзянка Беларусі, 25-гадовая беспрацоўная жыхарка Полацка, адседзела паўгода ў літоўскай турме за незаконнае перасячэнне дзяржаўнай мяжы.

Пра гэта БелаПАН паведамілі ў прэс-цэнтры Дзяржаўнага камітэта пагранічных войскаў рэспублікі. На мінулым тыдні ў пункце пропуску «Гудагай-1» яна была перададзена літоўскімі паліцэйскімі беларускім пагранічнікам.

Парушальніца мяжы, якая перайшла яе прыкладна паўгода таму пешшу па-за пунктам пропуску, адпраўлена дадому, а матэрыялы аб ўчыненым ёю злачынстве накіраваны ў аддзел унутраных спраў па месцы жыхарства.

Вячаслаў БУДКЕВІЧ, БелаПАН.

МІТЫНГ І ШЭСЦЕ ПРАЙШЛІ БЕЗ ІНЦЫДЭНТАЎ

Як паведаміла «Звяздзе» кіраўнік прэс-службы УУС Мінгарвыканкама Наталля Лапо, супрацоўнікамі міліцыі не было зарэгістравана ніводнага правапарушэння падчас правядзення 27 ліпеня ў беларускай сталіцы санкцыяніраваных гарадскімі ўладамі шэсця і мітынгу. Яны былі прымеркаваны да Дня незалежнасці, які быў афіцыйна адменены ў 1996 годзе. Адпаведна сіламі правапарадку не быў затрыманы ніводзін удзельнік акцыі.

Сапраўды, у панядзелак абодва бакі -- як арганізатары і ўдзельнікі дэманстрацыі, так і супрацоўнікі органаў правапарадку -- паводзілі сябе вельмі тактоўна і дружалюбна ў дачыненні адзін да адна-го.

Згодна з папярэдне абумоўленым планам, дэманстранты прайшлі па тратуарах і адной паласе праспекта Скарыны, што амаль не паўплывала на стабільную работу гарадскога транспарту і аўтамабільны рух па галоўнай артэрыі горада.

Не ўдалася нават правакацыя кучкі падлеткаў-«баркашоўцаў», якія, выкрыкваючы антыбеларускія і прафашысцкія лозунгі, паспрабавалі завязаць з дэманстрантамі бойку. Аднак на правакацыю ніхто не паддаўся: хуліганаў затрымалі і перадалі ў рукі міліцыі. Відаць, ніхто не жадаў псаваць святочны настрой.

Хаця, як паказаў мітынг, на самай справе настрой быў далёкі ад святочнага. Акрамя прывітанняў і віншаванняў з нагоды чарговай гадавіны прыняцця Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце і, адпаведна, Дня незалежнасці, з вуснаў прамоўцаў гучалі адкрытыя абвінавачанні ў адрас дзеючых уладаў. Напрыклад, Генадзь Карпенка, які вёў мітынг, заявіў, што за восем гадоў, якія мінулі з таго часу, калі Вярхоўны Савет прыняў гістарычны дакумент, рэальнага суверэнітэту і незалежнасці беларуская дзяржава дасягнуць так і не змагла.

Выказванні іншых удзельнікаў былі яшчэ больш радыкальнымі, што характэрна для мерапрыемстваў, якія ладзіць апазіцыя. Сярод выступаючых былі В. Голубеў, А. Дабравольскі, Ю. Хадыка, С. Багданкевіч, С. Шарэцкі, А. Лябедзька, П. Знавец, М. Статкевіч.

Мітынг прыняў рэзалюцыю, паводле якой у Беларусі па-ранейшаму застаецца рызыка страціць нават тыя рысы суверэнітэту, якія існуюць зараз. Паводле аўтараў дакумента, асноўная пагроза зыходзіць ад таго, што на фоне пагаршэння адносінаў з заходнімі дзяржавамі наша краіна можа быць «інкарпаравана ў састаў Расійскай Федэрацыі». Тэкст рэзалюцыі апазіцыя збіраецца перадаць групе расійскіх і ўкраінскіх губернатараў, якія днямі будуць знаходзіцца ў Мінску.

Нельга не заўважыць таго факта, што 27 ліпеня ў чарговы раз апазіцыйныя партыі пераадолелі міжусобныя рознагалоссі і правялі агульную акцыю пад кіраўніцтвам аб'яднанага аргкамітэта. Таму над удзельнікамі шэсця луналі адначасова сцягі і БНФ, і АГП, і БСДП «НГ», і Беларускай партыі працы. Мусіць, па гэтай прычыне арганізатарам удалося сабраць на мерапрыемства значную колькасць людзей. Прыкладна тры тысячы чалавек, нягледзячы на пару водпускаў, узялі ўдзел у акцыі.

Юрась ЛЯШКЕВІЧ.

ПОЕЗД — У ЛІК ПАГАШЭННЯ ДОЎГУ

З прывітальным адрасам ад рабочых расійскага горада Дземіхава Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь і беларускім чыгуначнікам прыбыў у распараджэнне віцебскага аддзялення чыгункі унікальны поезд.

Ён выраблены па сумеснаму беларуска-расійскаму праекту, аснашчаны цеплавозам і прызначаны для прыгарадных зносінаў. Кожны з дзесяці вагонаў Дземіхаўскага машынабудаўнічага завода можа ўмясціць да 300 чалавек. У адрозненне ад тыпавых электрычак і дызель-паяздоў, ён аснашчаны туалетам і ацяпляецца зімой.

Пасля абкаткі састаў, прыпісаны ў дэпо Полацка, будзе курсіраваць па маршруту Бігосава—Смаленск.

Гэты поезд, які каштуе каля 3 мільёнаў долараў, атрыманы Беларускай чыгункай у лік пагашэння доўгу расійскага Міністэрства шляхоў зносінаў. Мяркуецца, што такім жа чынам у Віцебск паступяць яшчэ тры саставы з Дземіхава, а ўсяго ў Беларусь — 20.

Вольга СІДАРОВІЧ, БЕЛТА.

На свае вочы

КНЯСТВА Ў СЭРЦЫ ПІРЫНЕЯЎ

Свая ў Андоры — няхай сабе і не зусім багатая і цікавая на падзеі — і гісторыя.

У VI-VII стагоддзях, пасля захопу Іспаніі і Партугаліі, сюды таксама прыйшлі арабы. Аднак ужо ў 732 годзе сапраўдная хваля маўраў была спынена французскімі войскамі Карла Мартэла і адкінута за Пірынейскія горы. Мужна і адчайна змагаліся тады за сваю свабоду і андорскія партызаны на чале з Маркам Альмагаберам. У 805 годзе праз перавал Фантаржэнт яны правялі французскую армію, якая канчаткова разбіла маўраў. Паводле падання, кароль Людовік Набожны (Благочестивый) у знак падзякі жыхарам далін прадаставіў ім свабоду і незалежнасць, а саму мясцовасць назваў біблейскім імем «Эндар», якое і легла ў аснову назвы краіны. У дзяржаўным музеі пра гэта сведчаць многія экспанаты, у тым ліку і кніга французскага вучонага Русільёна «Андора», выдадзеная яшчэ ў 1823 годзе ў Парыжы. Гэта кніга — сапраўдны летапіс дзяржавы...

А тады — у 819 годзе — было складзена «Пісьмо свабоды», якое і дало права незалежнасці абшчынам сялян і пастухоў далін рэк Валіра і Ардзіна. Ён і стаў лічыцца годам заснавання Андоры.

Але... Як часта гэта «але» «умешваецца» ў ходу гісторыі, уносіць у яе заканамернае развіццё нечаканыя, іншы раз проста неверагодныя штрыхі, зігзагі, павароты. Так здарылася і ў сітуацыі вакол карлікавай Андоры.

Літаральна адразу пасля атрымання незалежнасці мясцовасць стала арэнай барацьбы за ўладу над ёй. Урхельскі граф Сізебу, атрымаўшы ўплыў на большасць тэрыторыі, у 1133 годзе падарыў «навечна» Андору епіскапам Урхеля. Асобныя ж сядзібы належалі графскай дынастыі Фуа, і паміж уладальнікамі іх нярэдка здараліся крывавыя сутычкі, раздраі. Так працягвалася амаль 150 гадоў — да таго часу, калі ў 1278 годзе, паводле сведчання ўсё таго ж Русільёна, паміж графамі і епіскапамі быў заключаны мірны дагавор. Фуа атрымалі ў Андоры права на свецкую ўладу, а епіскапы — на духоўную. Абодва бакі пачалі прызначаць сваіх прадстаўнікоў у Андору і атрымліваць ад яе даніну: 960 франкаў на карысць графаў і 430 песет — на карысць епіскапаў. Дарэчы, гэты чыста сімвалічны аброк Андора плаціла Францыі і Каталоніі амаль што сем стагоддзяў!

У 1868 годзе была абвешчана канстытуцыя Андоры і ўпершыню ў яе гісторыі сабраўся парламент — Генеральны савет княства.

Цікавай старонкай азнаменаваліся для дзяржавы-малюткі трыццатыя гады ўжо нашага стагоддзя. У жніўні-кастрычніку 1933-га тут успыхнулі народныя хваляванні, якія атрымалі назву Андорскай рэвалюцыі. У выніку яе ўсім мужчынам старэй 25 гадоў было дадзена ўсеагульнае выбарчае права, а ў карыстанні абшчыннымі землямі, лугамі, пашамі, водамі і лясамі з'явіліся льготы. Наступны ж, 1934 год, наогул прынёс падзеі проста неверагодныя.

Спробу захапіць уладу ў княстве і аб'явіць яго манархіяй паімкнуўся ажыццявіць былы «наш» чалавек — 38-гадовы белаэмігрант Барыс Скосыраў. Заручыўшыся падтрымкай уплывовых асоб за мяжой і ў самой Андоры, акружыўшы сябе такімі ж, як і сам, палітычнымі прахвостамі, ён спачатку аб'явіў сябе князем, а потым — і каралём Андоры Барысам І. Самазванец звярнуўся да народа з шэрагам маніфестаў, падпісаў указы, у адпаведнасці з якімі распусціў парламент, замяніў кіраўніцтва практычна ва ўсіх уладных структурах... Так працягвалася да 1941 года, калі нарэшце самазванага «караля» даставілі ў французскі канцэнтрацыйны лагер Вернэ — як кажуць, на месца прызначэння.

І наогул дзяржаўнае ўстройства Андор літаральна да нядаўняга часу было больш чым арыгінальным. У адпаведнасці з канстытуцыяй гэта — княства. Уладай князёў былі надзелены ўрхельскі епіскап і прэфект дэпартамента Усходнія Пірынеі. Іх прадстаўнікі (на мясцовай мове — вігье) валодалі пытаннямі знешняй палітыкі, фінансаў, пошты, міліцыі; мелі права заканадаўчай ініцыятывы, выдавалі ўказы і дэкрэты, з'яўляліся суддзямі ў апеляцыйным судзе і вышэйшых трыбуналах па грамадзянскіх і крымінальных справах. Тэрмінам на чатыры гады выбіраўся прадстаўнічы орган — Генеральны савет, які складаўся з 28 чалавек, аднак кожныя два гады палова саставу яго абнаўлялася. Палітычныя партыі і прафесіянальныя саюзы работнікаў у часы праўлення прадстаўнікоў Францыі і Іспаніі ў Андоры забараняліся.

Такім чынам, па канстытуцыі — княства, а па сутнасці гэта была рэспубліка, што знаходзілася пад пратэктаратам дзвюх магутных суседніх дзяржаў.

У снежні 1989 года ў Андоры прайшлі чарговыя выбары ў Генеральны савет. Новы ўрад узначаліў О. Рыбас-Рэйг. Паступова, аднак настойліва правёўшы палітычныя рэформы ў краіне, гэты таленавіты і мудры (так характарызуюць яго самі андорцы) кіраўнік дабіўся нарэшце для сваёй радзімы поўнай, сапраўднай самастойнасці і незалежнасці ад Іспаніі і Францыі. Ён змог пераканаць магутных і ўплывовых ранейшых гаспадароў Андоры ў жыццёвай неабходнасці яе суверэнітэту. І гаспадары пагадзіліся з ягонымі довадамі...

Андору прызналі, прынялі ў сваю сям'ю міжнародная супольнасць, самыя розныя арганізацыі, установы, аб'яднанні. Яна — член ААН, ужо не адзін год выступае самастойнай камандай на ўсіх буйнейшых спартыўных спаборніцтвах, у тым ліку — і на Алімпійскіх гульнях. Яе паважаюць, паважае свет і сама Андора...

Тут няма яшчэ сваёй, уласнай валюты, таму на роўных выкарыстоўваюцца франкі і песеты. Банкаўская сістэма пакуль што амаль на 90 працэнтаў належыць іспанскім кампаніям, аднак адсутнасць дзяржаўнага кантролю над фінансавымі аперацыямі, што не абкладаюцца падаткамі, прыцягвае ў краіну замежныя капіталы самага рознага паходжання. Яна нікому і ніколі не пагражала і не пагражае сілай: у Андоры няма ўзброеных войскаў, за выключэннем міліцыі, што назірае за грамадскім парадкам. Дарэчы, андорцы маюць права на нашэнне зброі, чым, аднак, не злоўжываюць, але — ганарацца.

Ну а за кошт чаго жыве, вядзе сваю самастойную эканамічную дзейнасць гэта дзяржава?

Асноўны даход дзяржаўнай казне дае, як і трэба таго чакаць, турызм. Каля паловы нацыянальнага прыбытку Андора мае ад гандлю і абслугоўвання замежных турыстаў. Апошнім часам да трох мільёнаў наведвальнікаў прымае яна. Тры мільёны на 65 тысяч жыхароў!

Каля 20 працэнтаў усёй пасяўной плошчы займае тытунь. Ён — таксама адна з істотных крыніц прыбытку. Перапрацоўваецца тытунь на мясцовых фабрыках і потым — у гатовым выглядзе — пастаўляецца ў Францыю і Іспанію. Прычым, пастаўляецца... кантрабандным чынам, паколькі ў гэтых дзяржавах уведзена манаполія на яго. Тым не менш, так званы «транзітны гандаль» існуе і нават — квітнее. Занятак ім лічыцца ў Андоры справай мужных і смелых людзей, і яны, як сцвярджалі мае субяседнікі, вельмі няблага жывуць...

А яшчэ тут вырошчваюць ячмень і жыта, вінаград і бульбу, кукурузу і аліўкі... Гадуюць кароў і авечак, атрымліваюць і ў вялікіх аб'ёмах вывозяць за мяжу звыш 50 відаў (!) сыроў, воўну, аўчыны. Здабываюць жалезную руду, крыху — серабра, свінца, каштоўных камянёў...

Пакідаеш гэту дзяржаву-малютку з гонарам за яе народ, за яго справы. Ніяк не можаш паверыць, што ў такіх складаных, неверагодна цяжкіх прыродных умовах змаглі людзі пабудаваць сабе дом-дзяржаву, дабіцца ў рэшце рэшт самастойнасці і рэальнай незалежнасці, права, як сказаў бы наш класік, «людзьмі звацца...» Усё ў іх ёсць, усім яны задаволены. А што, уласна кажучы, чалавеку яшчэ трэба?!.

Анатоль МЯСНІКОЎ.
Фота аўтара.
Мінск—Барселона—Андора-ла-В'еха.

(Заканчэнне. Пачатак у №148)

Рэдакцыя «Звязды» выказвае падзяку за арганізацыю паездкі свайго журналіста ў Андору турысцкай кампаніі «Сакуб-Халідэй» і яе генеральнаму дырэктару Сяргею Букасу.

«САКУБ-ХАЛІДЭЙ» гэта:
выдатная арганізацыя замежных турыстычных паездак і падарожжаў у самыя розныя краіны свету;
ветлівасць і прыстойнасць у абыходжанні з кліентамі;
сучасны ўзровень абслугоўвання турыстаў.
«САКУБ-ХАЛІДЭЙ» з вамі і для вас!
Тэлефоны для даведак: 232-10-34; 232-86-30; 232-14-26.

На атрыманне Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь

Васіль ФЯЦІСАЎ:
«БЕЛАРУСКІ МЕТАЛАКОРД — АДЗІН З ЛЕПШЫХ У СВЕЦЕ»

Сёння, калі многія прадпрыемствы рэспублікі знаходзяцца, што называецца, на мяжы выжывання, Беларускі металургічны завод у Жлобіне ўжо перавысіў праектную магутнасць. Няма тут і праблемы са збытам: каля 70 працэнтаў вырабаў ідзе на экспарт, прычым значная частка — у краіны далёкага замежжа. Прадукцыю БМЗ добра ведаюць у Еўропе, Паўночнай Афрыцы і Паўднёва-Усходняй Азіі. Апошнім часам прадпрыемства зрабіла свайго роду прарыў і на рынкі ЗША. Асабліва славяцца беларускія металургі сваім металакордам. Яго выкарыстоўваюць для вырабу аўтамабільных шын такія вядомыя ў свеце фірмы, як германскія «Кантыненталь» і «Фульда», аўстрыйская «Земперыт»... Па дарогах свету імчаць «Мерседэсы», «Вольва» і іншыя славутыя маркі машын, шыны якіх зроблены на аснове беларускага металакорду. А ўсё таму, што па ацэнках замежных спецыялістаў беларускі металакорд адпавядае лепшым сусветным узорам. Без гэтага наўрад ці ўдалося б БМЗ прабіцца са сваімі вырабамі на рынкі многіх краін. І калі ўжо буйнейшая ў свеце па экспарту металакорду бельгійская фірма «Бекерт» мусіла зазначыць у друку, «што 1996 год быў адным з самых неспакойных гадоў, са слабым попытам на металакорд і ўзмацненнем канкурэнцыі ў Еўропе з боку Беларусі з месцазнаходжаннем Беларускага металургічнага завода ў г. Жлобін», то гэта гаворыць пра многае. Якое іншае прадпрыемства на ўсёй постсавецкай прасторы можа пахваліцца гэтым?

І заканамерна, што менавіта «Комплексная распрацоўка тэхналогіі і асваенне вытворчасці канкурэнтаздольных канструкцый металакорду на Беларускім металургічным заводзе» была вылучана на атрыманне Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь. Сярод тых, хто прэтэндуе на высокае званне лаўрэата, — дырэктар па новай тэхніцы В.П. Фяцісаў, загадчык даследчага цэнтра металургіі Нацыянальнай акадэміі Рэспублікі Беларусь Б.А. Бірукоў, генеральны дырэктар БМЗ Ю.В. Феакцістаў, намеснік начальніка тэхнічнага ўпраўлення Г.В. Баглай, дырэктар па метызнай вытворчасці В.В. Філіпаў і начальнік цэха металакорду № 1 А.П. Паўлючэнка.

Мы сустрэліся з адным з распрацоўшчыкаў новай тэхналогіі вытворчасці металакорду дырэктарам па новай тэхніцы БМЗ, доктарам тэхнічных навук Васілём Фяцісавым і папрасілі яго пракаменціраваць, які ўплыў гэта распрацоўка аказала на вытворча-гаспадарчую дзейнасць прадпрыемства.

— У мінулым СССР, які выпрабляў 76 мільёнаў шын у год, — гаворыць Васіль Паўлавіч, — займаў другое месца ў свеце па аб'ёму вытворчасці шын. Цяпер Расія з гадавой вытворчасцю ў 20 мільёнаў шын займае 11—12-е месца на сусветным рынку. А загрузка вытворчых магутнасцяў расійскіх шыннікаў, якія з'яўляюцца традыцыйнымі спажыўцамі беларускага металакорду, не перавышае 40 працэнтаў. Ва ўмовах павышанай канкурэнцыі з боку вытворцаў металакорду Расійскай Федэрацыі, Украіны і краін далёкага замежжа БМЗ распрацаваў спецыяльную праграму павышэння якасці прадукцыі. Што ўяўляе сабой «Комплексная распрацоўка тэхналогіі і асваенне вытворчасці канкурэнтаздольных канструкцый металакорду»? Работа ўключае ў сябе комплекс навуковых і канструкцыйных распрацовак у галіне стварэння новых, альтэрнатыўных, больш эканамічных, перспектыўных і канкурэнтаздольных канструкцый металакорду, удасканаленне кантрактных і стварэнне новых тэхналогій вытворчасці дроту і металакорду. Усе гэтыя распрацоўкі ўкаранёны ў вытворчасць, што дазволіла асвоіць праектныя магутнасці, а таксама выйсці на сусветны рынак і паспяхова там замацавацца.

— Якая эканамічная эфектыўнасць ад укаранення ў вытворчасць выкананых распрацовак?

— Рэалізацыя гэтых распрацовак дазволіла давесці продаж беларускага металакорду на рынках СНД да 65 працэнтаў ад яго агульнага спажывання, а на рынках далёкага замежжа — да 30—35 працэнтаў і павялічыць экспартны патэнцыял завода на 23,3—26,7 мільёна долараў у год. Эканамічны эфект ад укаранення альтэрнатыўных і перспектыўных канструкцый металакорду за перыяд з 1993 па 1997 год склаў адзін трыльён чатырыста восемдзесят сем мільярдаў дзвесце пяцьдзесят мільёнаў сто сорак адну тысячу беларускіх рублёў. Гэта станоўча адбілася і на вырашэнні такой сацыяльна вострай праблемы, як беспрацоўе. Дзякуючы росту аб'ёмаў вытворчасці металакорду ўдалося захаваць усе рабочыя месцы для 3240 працаўнікоў БМЗ.

— А якім чынам укараненне найноўшых распрацовак адбілася на якасных паказчыках?

— Важна тое, што ўдалося сертыфікаваць сістэму якасці завода па стандарту ISO 9002. Да таго ж высокі якасны ўзровень беларускага металакорду і дроту пацверджаны сертыфікатамі якасці вядучых вытворцаў аўтамабільных шын, у тым ліку такіх як «Кантыненталь» (Германія), «Гудзіер» (Люксембург), «Пірэлі» (Італія), што яшчэ раз указвае на высокую эфектыўнасць распрацаванай навуковай і тэхналагічнай канцэпцыі вытворчасці латуніраванага дроту і металакорду на БМЗ.

— Якая геаграфія паставак дроту і металакорду БМЗ?

— Апрача краін СНД мы адпраўляем дрот і металакорд у Германію, Люксембург, Аўстрыю, Італію, Славакію, Польшчу, Славенію, Чарнагорыю, ЗША. Зацікавіліся гэтай нашай прадукцыяй і ў краінах Азіі.

— Якія навукова-тэхнічныя распрацоўкі знайшлі міжнароднае прызнанне?

— Вітая драцяная структура, металакорд 3х5хd, абароненая патэнтам Расійскай Федэрацыі і Еўрапатэнтам, які зарэгістраваны ў Германіі, Вялікабрытаніі, Бельгіі, Францыі, Італіі і Аўстрыі.

— Што можна сказаць пра далейшыя перспектывы развіцця металакордавай вытворчасці на БМЗ?

— На аснове выкананай работы, якая вылучана на атрыманне Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь, цяпер на заводзе вядуцца актыўныя даследчыя і праектна-канструктарскія распрацоўкі па стварэнню тэхналогіі і ўдасканаленню абсталявання для таго, каб у бліжэйшыя 2-3 гады арганізаваць вытворчасць звыш- і ультравысокатрывалых канструкцый металакорду. Гэта дазволіць заводу умацаваць і захаваць свае пазіцыі на сусветным рынку. А ўвогуле хачу зазначыць, што беларускі металакорд сёння па праву адзін з лепшых у свеце.

Гутарыў
Уладзімір ГОЙТАН.

Апошнім часам свет захліснула самая сапраўдная хваля падлеткавай агрэсіі і насілля: у ЗША падлеткі расстрэльваюць сваіх аднагодкаў з аўтаматаў; у Японіі дзеці ходзяць у школу з халоднай зброяй; у Беларусі дзяўчынкі рыхтуюцца пусціць пад адхон пасажырскі цягнік. Ці ёсць якія-небудзь тлумачэнні гэтым фактам — аб гэтым гутарка нашага карэспандэнта з галоўным спецыялістам Міністэрства аховы здароўя РБ па дзіцячай псіхіятрыі Наталляй ГРЫГОР'ЕВАЙ.

ПЯШЧОТА ДЛЯ ПСІХІЧНАГА ЗДАРОЎЯ ДЗЯЦЕЙ — БАЛЬЗАМ, А ТЭЛЕБАЧАННЕ — АТРУТА

Фота Максіма МАЛІНОЎСКАГА

— Наталля Канстанцінаўна, як бы вы ацанілі псіхічнае здароўе нашага падрастаючага пакалення?

— Лепш за ўсё тут гавораць лічбы. А статыстыка ў нас сёння такая: у Беларусі на кожную тысячу дзіцячага насельніцтва краіны прыпадаюць 29 дзяцей з нервова-псіхічным расстройствам. Канкрэтна псіхічныя захворванні рэгіструюцца ў 19,1 працэнта дзяцей з кожнай тысячы дзіцячага насельніцтва. У структуры ж інваліднасці захворванні нервовай сістэмы ўтрымліваюць першае (39 працэнтаў), а расстройствы псіхікі — другое (33 працэнты) месцы.

Прычыны такой вялікай колькасці ў нашым грамадстве дзяцей з нервова-псіхічнымі захворваннямі самыя розныя: тут і небяспечная экалогія, і шкодныя ўмовы працы цяжарных жанчын, і алкагалізм бацькоў, і распаўсюджванне наркаманіі, і інфіцыраванне плода ва ўлонні маці...

— А ў якім узросце праяўляюцца псіхічныя і нервовыя расстройствы? Магчыма, іх можна неяк калі не папярэдзіць, то хоць бы своечасова выявіць і лячыць?

— Існуюць два так званыя крызісныя ўзросты. Бацькі павінны ведаць, што фразавая мова з'яўляецца ў дзяцей у два гады, і калі яна не з'явілася да трох гадоў, то гэта павінна стаць для іх пэўным сігналам.

Абследаванне дзяцей да трох гадоў выявіла высокую распаўсюджанасць нервова-псіхічных расстройстваў сярод дзяцей менавіта гэтай узроставай групы: затрымкі маторных, псіхічных функцый, парушэнні сну, развіцця і г. д. былі адзначаны ў больш чым 40 працэнтаў абследаваных дзяцей у нашай краіне.

Другі крызісны ўзрост — 6-7 гадоў, гэта час, калі дзіця ідзе ў школу. Мінімальная мазгавая дысфункцыя можа да школы і не паявіцца, і толькі калі пачынаецца ўзмоцненая мазгавая нагрузка на занятках, яна дае аб сабе знаць. Даныя аналізу паказалі, што больш чым 35 працэнтаў дзяцей ва ўзросце да 6 гадоў не дасягаюць школьнай сталасці і менавіта гэтыя дзеці трапляюць потым у разрад непаспяховых.

У шэрагу выпадкаў наяўнасць у дзіцяці язвеннай хваробы, астмы, вегета-сасудзістай дыстаніі таксама могуць паслужыць для бацькоў трывожным званком: не заўсёды гэтыя захворванні з'яўляюцца праяўленнем нейкага арганічнага працэсу — справакаваць іх могуць і розныя стрэсавыя сітуацыі, дэпрэсіўны пачатак. А гэта значыць, што лячыць трэба найперш прычыну захворвання, і лячыць псіхатэрапеўтычнымі метадамі. Заўважу, што ў Англіі, Германіі, ЗША псіхолаг, псіхатэрапеўт, псіхіятр з'яўляюцца самымі загружанымі і высокааплатнымі спецыялістамі, а ў нашым грамадстве паміж насельніцтвам і псіхіятрычнай службай існуе сапраўдны бар'ер. Людзі баяцца звяртацца да нас, бо баяцца трапіць на ўлік у дыспансер. Не многія з іх разумеюць, што кансультацыя ў дыспансерах і дыспансерны ўлік — не адно і тое ж. На кансультацыях спецыяліст дае бацькам парады, як працаваць з дзіцем, як яго выхоўваць, а на ўлік ставяцца толькі дзеці, небяспечныя для навакольных.

— Наталля Канстанцінаўна, а ці можна карані росту падлеткавай злачыннасці шукаць у псіхічным нездароўі нашых дзяцей?

— Калі раней закон упершыню пераступалі 17—18-гадовыя маладыя людзі, то сёння правапарушальнікам 11—12 гадоў, прычым сярод іх адзначаецца рост колькасці дзяўчынак. Прыходзіцца канстатаваць, што правапарушэнні сярод падлеткаў носяць асабліва жорсткі характар, аж да забойстваў. Ну што можна сказаць на тое, калі 11—12-гадовыя хлопчыкі забіваюць свайго аднагодка, каб зняць з яго красоўкі ці куртку?

Рост агрэсіўнасці пачынаецца ў дзіцяці з самага яго нараджэння. Настроенасць маці на аборт, абыякавасць у адносінах да малога ў перыяд цяжарнасці і ў першыя гады яго жыцця прыводзяць да таго, што ён пачынае помсціць не толькі сваім бацькам, але і навакольным. Дзіця недакармілі, недапесцілі... Між іншым, захворванні цэнтральнай нервовай сістэмы выяўлены ў 51 працэнта выхавальнікаў інтэрнатаў.

Вялікія прэтэнзіі ў мяне таксама да школ і псіхолагаў, якія там працуюць. Менавіта яны праводзяць праверку інтэлектуальных здольнасцяў вучняў, а затым настаўнікі, абапіраючыся на іх даныя, пачынаюць папікаць дзяцей: «Ты — дурань», «Ты — няздольны» і г. д. У выніку ў дзіцяці выпрацоўваецца вельмі нізкая самаацэнка, і ўсё гэта накладвае свой адбітак на фарміраванне яго асобы. Канфліктныя сітуацыі прымушаюць дзіця ўцякаць з дому, са школы і шукаць паратунку ў вулічных кампаніях. У дзяцей жа, асабліва падлеткавага ўзросту, дзеянні неабдуманыя і імпульсіўныя, і яны лёгка трапляюць пад чужы ўплыў. У нас быў такі выпадак: кампанія падлеткаў пабіла, а затым кінула ў рэчку хлопчыка, і «лідэр» гэтай кампаніі сам не падпусціў да берага дзіця (яно патанула) і не дазволіў іншым дапамагчы. Вось такая псіхалогія: калі я вінаваты — значыць гэту адказнасць павінны падзяліць са мной усе. Але калі пачынаеш потым размаўляць з малалетнімі забойцамі, яны паводзяць сябе як самыя звычайныя дзеці, плачуць, просяцца да мамы.

Надзвычай абвастрылася апошнім часам і праблема насілля ў сем'ях: жорсткасць бацькоў у адносінах да сваіх дзяцей — гэта яшчэ адна з прычын падлеткавай злачыннасці.

Экстрэмальныя ўмовы жыцця, канфлікты ў сям'і, школе, жорсткае абыходжанне правакуюць суіцыдальныя спробы ў дзяцей і падлеткаў. На працягу ўсяго паўтара года ў Мінску былі зарэгістраваны 223 спробы самазабойства, прычым 13 з іх завяршыліся лятальным зыходам.

— А як спецыялісты ацэньваюць уплыў на дзіцячую псіхіку тэлебачання, кіно і камп'ютэраў? Ці існуюць нейкія тлумачэнні таму, што тэлевізійная рэклама літаральна заварожвае малых і яны ведаюць герояў рэкламных ролікаў, магчыма, лепш, чым казачных персанажаў?

— Тэлебачанне і гульнявыя прыстаўкі мы адназначна адносім да шкодных звычак. Канешне ж, з аднаго боку, тэлевізійная інфармацыя і камп'ютэр развіваюць дзіця, але адначасова яны становяцца прычынай галаўнога болю, галавакружэнняў, непрытомнасці, зніжэння памяці і ўвагі. Прычым, калі перадача ці фільм пастаянна перапыняюцца рэкламай, у дзяцей парушаецца паслядоўная работа мозгу, бо ён пераключаецца на розную непатрэбную яму інфармацыю. Дзіцячы ж мозг моцна рэагуе на розныя знешнія раздражняльнікі, таму калі працэс узбуджэння ўзнікае ў адным ачагу (а мінімальную мазгавую дысфункцыю, г. зн. нейкія слабыя ачагі можна знайсці ў 70 працэнтаў дзяцей), то тут жа перадаецца ўсяму мозгу, што прыводзіць нават да эпілептычных прыпадкаў. У чалавека існуе так званы парог зрокавых ці слыхавых адчуванняў, і калі ён перавышаецца, мозг асабліва на гэта рэагуе. Я хачу сказаць, што калі ў рэкламе выкарыстоўваецца моцны гук, які перавышае парог дапушчальнага, у сенсорна-слыхавой зоне ўзнікае ачаг узбуджэння, які можа выклікаць спазм сасудаў галаўнога мозгу. Звышмоцным для дзіцячага мозгу раздражняльнікам з'яўляюцца таксама рэзкае чаргаванне на тэлевізійным ці камп'ютэрным экране шматколернага святла ці вялікая частата наслаення кадраў.

Сапраўдную тэлеэпідэмію мы назіралі ў Японіі, дзе пасля прагляду мультсерыялаў «Пакеман» больш як 700 падлеткаў трапілі ў бальніцу: раздражняльнік частаты колеру выклікаў узбуджэнне зрокавай сістэмы мозгу і арганізм адрэагаваў на гэта перарывістым дыханнем, ванітамі, сутаргавымі праяўленнямі на розных узроўнях.

Аб тым, што тэлевізар — не цацка, красамоўна сведчыць наступны прыклад. Амерыканскія вучоныя прыйшлі да высновы, што цяжарныя жанчыны, якія шмат часу праводзяць перад тэлевізарам, сур'ёзна рызыкуюць страціць плод: у 50 працэнтах назіраемых жанчын цяжарнасць завяршылася выкідышамі.

— Ці спрабавалі псіхіятры неяк змагацца з тэлевізійнай рэкламай?

— Нам заўсёды гавораць, што рэклама — гэта бізнес, грошы, без якіх тэлебачанне не зможа існаваць. Але зрэдку да нашых меркаванняў усё ж прыслухоўваюцца і знімаюць рэкламныя ролікі, якія нас асабліва хвалююць.

— А наколькі моцнае ўздзеянне на дзіцячую псіхіку аказваюць баевікі, трылеры і «ужасцікі»?

— Пасля прагляду такіх фільмаў у дзяцей развіваюцца неўратычныя і псіхічныя расстройствы, яны дрэнна спяць, сняць сны з рознымі жахамі, пачынаюць баяцца цемры і адзіноты.

Магчымы таксама зрокавыя і слыхавыя галюцынацыі: напрыклад, дзіця ў вобразе кветкі бачыць пачвару і пачвара яго аклікае. Цалкам верагодна, што пасля такіх тэлесеансаў «ужасцікаў» дзіцяці спатрэбіцца нават лячэнне ў псіхіятрычнай лячэбніцы.

— Заходнімі спецыялістамі было ўстаноўлена, што японская электронная цацка «Тамагочы» ўплывае на дзіцячую псіхіку далёка не самым лепшым чынам. Дзеці перажываюць пасля смерці віртуальнага звярка даволі моцныя стрэсы. Ці сутыкнуліся ўжо беларускія псіхіятры з гэтай праблемай?

— Так, у сем'ях, дзе адбывалася нейкае няшчасце (хтосьці памёр, трапляў у бальніцу або інш.), дзеці перажывалі ўсё гэта паўторна і ў выніку траплялі ў псіхіятрычную бальніцу з рэактыўным псіхозам, а правакуючым фактарам у развіцці псіхатычнага стану была дзіцячая цацка «Тамагочы».

— Наталля Канстанцінаўна, ці цікавіцца хто-небудзь меркаваннем дзіцячых псіхіятраў перш чым запусціць цацку ў продаж?

— У камісію, якая «прымае» цацкі, не ўваходзіць ні адзін псіхіятр...

Гутарку вяла
Надзея НІКАЛАЕВА.

Усё пра ўсё

Як склеіць сэрца?

Калі ў сэрцы не хапае асобага пратэіну-плакаглабіну, то яно проста развальваецца. Гэта паказалі доследы вучоных, якія назіралі за эмбрыёнамі мышэй. Высветлілася, што тканкі сэрца змацоўвае плакаглабін. Без яго сэрца не вытрымлівае механічных нагрузак, што прыпадаюць на яго, і жыве ўсяго некалькі дзён. Магчыма, у людзей некаторыя захворванні сэрца выкліканы менавіта недахватам гэтага пратэіну.

Вадкі скальпель

Рэзанне струменем вады даўно прымяняецца ў прамысловасці, а вось выкарыстаць гэты метад у хірургіі прапанаваў тры гады таму французскі інжынер Бертран Ганон. Зараз у дзвюх французскіх клініках выпрабоўваюць новы хірургічны інструмент: тканкі разразаюцца тонкім струменем стэрыльнага фізіялагічнага раствору, які падаецца пад ціскам 120 атмасфер.

Пачастуйце доктара цукеркай!

Псіхолаг Карнельскага універсітэта ў штаце Нью-Йорк Аліса Ізен шмат гадоў імкнецца зрабіць людзей шчаслівымі і вывучае іх паводзіны ў гэтым стане. Згодна з апытаннямі, напрыклад, калі падарыць пакупніку трыццацікапеечныя нажніцы для пазногцяў, то такая дробязь радыкальна паляпшае ўвесь далейшы дзень. Аліса Ізен вырашыла распаўсюдзіць свае даследаванні на ўрачоў і некаторым давала шакаладку перад пастаноўкай дыягназу, а некаторым не. Аказалася, што пасля салодкага «хабару» ўрачы больш хутка і правільна вызначаюць прычыну хваробы.

По матэрыялах друку падрыхтавала
Вікторыя КЛЯНОВІК.

УВАГА!

15 ліпеня 1998 года ў 8 гадзін 35 хвілін раніцы ў раёне чыгуначнага вакзала станцыі Жодзіна Мінскай вобласці з прыметамі гвалтоўнай смерці знойдзены труп Гушчынскага Г. А., а таксама ў непрытомным стане з траўмай галавы Сінкевіч І. Ф.

Просім грамадзян, якія маюць якую-небудзь інфармацыю, паведаміць па тэлефонах 296-36-37, 296-46-41, 222-96-20 у УУС на транспарце МУС Рэспублікі Беларусь, у Барысаўскі АУС на транспарце па тэлефонах 94-316, 94-302 або па 02 у бліжэйшы аддзел міліцыі.

Ананімнасць і ўзнагароджанне гарантуюцца.

СЁННЯ

СОНЦА

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск –	5.16	21.14	15.58
Віцебск –	5.00	21.10	16.10
Магілёў –	5.06	21.03	15.57
Гомель –	5.11	20.52	15.41
Гродна –	5.34	21.26	15.52
Брэст –	5.40	21.22	15.42

МЕСЯЦ

Першая квадра 31 ліпеня.
З 11.04 — 7-я месяцавыя суткі.
Месяц у сузор'і Шаляў.

ІМЯНІНЫ

Пр. Афінагена, Паўла, Валянціны, Юліі К. Марты, Людмілы

НАДВОР'Е

Сёння ўдзень па рэспубліцы захаваецца воблачнае з праясненнямі надвор'е, у цэнтральных і ўсходніх раёнах моцныя ліўні, навальніцы, магчымы град. Вецер паўднёва-заходні, умераны, парывы да 15—20 м/сек., ва ўсходніх раёнах месцамі да 25—28 м/сек. Тэмпература паветра ў Гродне 21—23, Брэсце, Мінску — 22—24, Віцебску — 27—29, Магілёве — 28—30, Гомелі — каля 30 градусаў цяпла.

У наступныя двое сутак пераменная воблачнасць, 30-га — па крайняму ўсходу рэспублікі пройдуць кароткачасовыя дажджы, навальніцы; 31-га — пераважна без ападкаў. Вецер няўстойлівы, слабы, парывы да 12 м/сек. Тэмпература 30-га ўначы — 9—14, удзень — 21—26; 31-га ўначы — 12—17, удзень — 23—28 градусаў вышэй нуля.

Сядзіба

Выпуск № 26 (414)

Рубрыку вядзе Мікалай ЧАХОЎСКІ

Падкормім сад?

Ёсць сады, дзе ад пладоў літаральна голле трашчыць. Дрэвам вельмі цяжка. Пад галіны падстаўце падпоры. А караням дайце надзейнае сілкаванне.

Прабівайце ломам ці капайце лапатай бліжэй да краёў кроны радочкі-ямкі і кладзіце ўгнаенне. Той жа гной ці мінералку. На два пагонныя метры можна смела даваць два вядры каравяку, які пачаў інтэнсіўна разлагацца, і да 50 г нітрафоскі. Можна ўсё гэта даць і ў вадкім стане: каравяк — у прапорцыі 1:8, а курыны памёт — 1:12.

Дадаткова даць па 30 г салетры — азотныя ўгнаенні вымылі дажджы. Зрабіць гэта да 15 жніўня.

Нізкія кусты можна апрацаваць венікам па лісцях. Растворы працэджваюць. На кожнае 10-літровае вядро даваць два літры настоенага каравяку і па 2 г марганцоўкі і бураксу, 4-5 г меднага купарвасу, 17 г (лыжку) мачавіны. Гэта будзе і сілкаванне (пажыўныя рэчывы знойдуць свайго адрасата адразу), і трывалая абарона ад шкоднікаў і хваробаў. Тым больш, што многія пладовыя кусты ўжо аддалі ўраджай.

Не растуць памідоры? Няма ўраджаю на агурочніку?

Гэтыя трывожныя пытанні дачнікі і сяляне задаюць не толькі сабе, але і суседзям. Ёсць званкі ў рэдакцыю. Між тым, нічога дзіўнага няма. І агуркі, і памідоры патрабуюць сярэдняй тэмпературы дня і ночы вышэй за 15 градусаў. У нас былі дні з тэмпературай недзе ў 18 градусаў, а ночы ўсяго 7—10. І такія ўмовы трымаліся доўгі час. Дадайце сюды надзвычай працяглы (амаль месяц!) мокры перыяд — і ўсё стане на свае месцы.

Ды што казаць, калі нават буракі не спяшаюцца аддзячыць важкай прыбаўкай. Быццам заснулі на месцы морква і нават рэдзька.

На агурочніку сёння мэтазгодна зняць хворыя лісты. Яны не павінны заражаць іншых. Знялі — спаліць. Па зялёным конусе зрабіць апрацоўку такім саставам: 30 г мачавіны, 10 г меднага купарвасу, 2 г марганцоўкі на 10 літраў вады. Медны купарвас развесці асобна ў гарачаватай вадзе. Сістэматычна апрацоўваць лісце пад вечар настоямі каравяку (1:15). Гэта можна рабіць амаль штодня ці два-тры разы на тыдзень.

Пад корань даць каравяк у водным растворы (1:6). Раствор абавязкова нагрэты на сонцы. На вядро вады дадаць літр настоенага попелу. Расліны падрыхліць як мага глыбей.

Памідоры таксама падкарміць, як і агуркі, пад корань. Па лісцях прымяняць сумесь, дзе колькасць меднага купарвасу павялічана да 20 г. Гронкі апрацаваць выцяжкай суперфасфату. У вядры вады развадзіць на сонцы 200 г суперфасфату. Увесь час памешваць. Браць толькі 1-2 літры пасля адстойвання і гэтым растворам пырскаць на гронкі. Абавязкова двойчы з інтэрвалам у 8 дзён апрацаваць усе кусты супраць фітафторы. Выкарыстоўваць розныя прэпараты. Скажам, «аксіхом-80» — пасля бардоскую вадкасць ці наадварот. Ніжнія хворыя лісты зрэзаць і спаліць. Усе органы росту трэба прышчыпнуць. Ніякага росту! Цяпер уся ўвага пладам. Налівайцеся!

«Тапаз» і «аксіхом» — прэпараты надзейныя

У канцы ліпеня наш агарод быццам нейкі базар. «Людна» ад розных матылькоў. На раслінах быццам у райскіх мясцінах адчуваюць сябе тля, павучкі ды жучкі, белым пакрывалам усцілае кусты парачак мучністая раса. Што зробіш, умовы для размнажэння шкоднікаў і хвароб найлепшыя, бо вельмі цёпла і вельмі сыра.

Хочам мы таго ці не, а неабходна браць у рукі апырсквальнік.

Спачатку пра хваробы. Ёсць прэпараты дакладна нацэленыя. Яны знішчаюць ці не даюць развівацца адной якой-небудзь бядзе. Але вучоныя зрабілі такія таблеткі, якія прыдатныя для многіх раслін. Спектр іх дзеяння пашыраны. Вось «аксіхом-80». Ён уяўляе сабой парашок ці таблетку. На 10 літраў вады неабходна класці дзве таблеткі. Развесці, памешваючы, прафільтраваць. І адразу ж пачаць апрацоўку. Раўнамерна намочваць лісце. Калі апарат адрэгуляваны, то з наканечніка вылятае пылападобнае воблака. Быццам туман. Сядзе на ўсе часткі расліны, нават на ніжні бок лісточка. А гэта якраз і трэба. Норма — калі з лісцяў пачынае капаць.

«Аксіхом-80» знішчае фітафтору, мучністую расу, макраспароз. Прэпарат не вельмі стойкі. Звычайна праз два-тры тыдні ён поўнасцю разбураецца.

Прыкладна на такія ж хваробы, як і «аксіхом», нацэлены другі прэпарат — «тапаз». Выпускае яго Расія сумесна са Швейцарыяй. Ампулу развесці ў 8 ці 10 літрах вады. Для парэчак і агрэсту браць максімальную колькасць вады — 10 літраў, для агуркоў — на 2 літры менш. «Лекі» малатаксічныя для людзей і жывёл. Усё ж посуд павінен быць асобны. У тым вядры не рыхтуем нават корм для жывёлы і не мыем бульбу. Парэчкі і агрэст апрацаваць тройчы, а агуркі — толькі два разы за сезон.

Супраць хвароб выкарыстоўваюць і нашу добрую знаёмую — бардоскую вадкасць. Яна найбольш бясшкодная, бо ўжо на восьмы дзень пасля апрацоўкі медны купарвас і вапна губляюць сваю агрэсіўнасць.

Са шкоднікамі барацьба больш складаная, бо многія з іх прызвычаіліся да ядаў. Апрацоўваючы расліну, мы імкнёмся патрапіць не на шкодніка і яго кладкі, а на лісточкі і сцябліны. Прэпарат быццам напаўняе той ліст. Цяпер прыходзіць, скажам, каларадскі жук ці яго лічынка, спрабуюць «ежу». І толькі ў страўніку адбудзецца дзеянне яду. Супраць вусеня і жука добра паказала сябе «каратэ». Але не горш і іншыя прэпараты. Іх трэба пытаць у магазінах «Белсельгасхіміі» і іншых арганізацыях.

У час апрацоўкі на тварах людзей павінна быць марлевая павязка, акуляры. Калі раствор трапіў на скуру ці твар, трэба абавязкова тут жа прамыць цёплай вадою з мылам. Калі ўзялі ў рукі апырсквальнік, то не курыць і не піць. Закончылі справу, вымыліся з мылам, — тады і курыце.

Усе яды хаваць як мага далей. Асабліва сачыць, каб іх не дасталі дзеці. Памяшканне цёмнае, халаднаватае і сухое. Калі прэпарат выкарысталі не ўвесь, то тое, што засталося, знішчыць, закапаўшы далей ад вадаёмаў. Па гэтай жа прычыне імкнуцца да таго, каб не было лішкаў. Выкарыстоўваць усё.

Перапіска з чытачамі

Аляксандру ПАНЦЯЛЕЕВУ,
г. Светлагорск.

Шмат зайцоў зусім не да бяды. Практыка паказвае, што нават цэлая сямейка на адной дачы не знішчыць ураджай. А людзям задавальненне: прачнуўся раніцою, зірнуў пад яблыню — ляжаць касыя.

Звяркі вельмі палахлівыя. Калі яны вам надакучылі, завядзіце, Аляксандр Уладзіміравіч, сабаку — адвечнага ворага зайца. Усё будзе ў норме. А труціць прышэльцаў нельга.

Анатолю КАШЭВІЧУ,
Лельчыцкі раён.

Мусім паўтарыць: каларадскага жука можна знішчыць толькі хімічнымі прэпаратамі. Цяпер шмат дзе жыруюць сталыя асобіны і чырванаватыя лічынкі. Гэта ўжо не першае пакаленне. І іх неабходна знішчыць, бо на наступны год стане больш. Памятайце толькі, што апошняя апрацоўка за 20 дзён (лепш за месяц) да ўборкі клубняў.

Марыі ПАРХІМЧЫК,
г. Мінск

Буракі, якія не выраслі на вашай дачы, трэба абавязкова прарэдзіць. Безумоўна, выдаляць у першую чаргу малыя. Адзін экземпляр ад другога на адлегласці 5—10 см. Падрыхліць. Падкарміць. Састаў такі: на вядро вады (лепш цёплай) узяць літровы слоік попелу і 40 г салетры. Спачатку суткі-двое настойваць попел. У гатовы настой дадаць салетру, памяшаць. Праз 10 хвілін падкармліваць. Вядро расходаваць на 20 раслін.

Калі ўсё знікне ў глебе (праз 1—3 гадзіны), падрыхліць і акучыць клубні зямлёй.

Магчыма, такую аперацыю трэба будзе прарабіць яшчэ раз. У канцы жніўня-верасні здымаць першы ўраджай.

Як падоўжыць жыццё плёнкі

Не сакрэт, што сваім поспехам на дачах і сялянскіх надзелах людзі ў многім абавязаны лёгкаму сінтэтычнаму матэрыялу — плёнцы. Недзе яшчэ прымяняюць шкло, спанбонд. Але плёнка дамінуе. Сёлета ў мінскіх магазінах і на базарах за ёю была чарга. Пад празрыстай тканінай цяплей нават у халодныя ночы.

Звычайна плёнку выкарыстоўваюць на працягу двух гадоў. Пасля яна так псуецца, што, здаецца, месца цэлага не знойдзеш. Але калі крыху патурбавацца, то тэрмін можна падоўжыць да трох і нават чатырох гадоў.

Псуюць матэрыял сонца, вільгаць і вецер. Самае важнае — не дапускаць выцягвання палатна пад уздзеяннем дажджу (так званыя «кішэні») і ветру, калі вялікія пралёты і палатно што той парашут: то надзімаецца, то раптам ападае. І кожны «ўдых» і «выдых» маленькім ранамі адзначаецца на плёнцы.

У цёплае надвор'е плёнку мацаваць свабодна, напуск да 15—20 працэнтаў. У халады яна сціскаецца і сама нацягваецца. Калі холадна, нацягваць амаль без напускаў. На «даху» і па бакавінах «прашнураваць» тонкім дротам, вяровачкамі-ніткамі, шнуркамі з поліэтылену. Прыбілі ўсё — зверху зноў замацавалі тымі ж шнуркамі.

Бліжэй да канца схілаў даху «шнуроўка» даволі частая — праз кожныя 10—15 см, уверсе — радзейшая. На такой абрашотцы плёнка ляжыць роўна, ніколі не бывае зацёкаў.

Як бы ні бераглі плёнку, а час ад часу ўтвараюцца дзіркі і яе трэба латаць. Для гэтага дастаткова мець прас, плёнку і габляваную дошчачку па шырыні ці крыху больш за шырыню праса.

Робім так. На дошку і габляваны бок зверху пакладзём газету ці белую паперу, на іх — плёнку з дзіркамі, зноў кавалак плёнкі шырэйшы, чым дзірка, і паперу. Праводзім два-тры разы прасам. Склейванне поўнае, бо пад тэмпературай плёнка плавіцца, зрастаючыся ў адно цэлае. Спачатку кожны павінен патрэніравацца, як кажуць, — набіць руку. Прасам можна праводзіць паволі — тэмпература склейвання акажацца большай, ці больш хутка — тэмпература будзе меншая.

Газету ці паперу, якую выкарыстоўвалі, лёгка аддзяліць, калі змачыць некалькі разоў вадою. Папера вельмі падатлівая, нястойкая да вады. Яе можа змыць нават дождж. Не адразу, а за два-тры разы.

Захоўваць плёнку абавязкова сухой і ў месцах з больш-менш пастаяннай тэмператрай. Вядома, без доступу сонечных промняў і рэзкіх ваганняў тэмпературы.

Мыць ці не мыць палатно? Абавязкова мыць. Раскладзіце на траве і прайдзіцся з абодвух бакоў мокрай анучай, калі трэба — выкарыстайце мыйны парашок. На ветрыку плёнка сохне хутка. Яе скруціць у рулончык і змясціць у прахалоднае і без сонца і яркага святла месца.

Падвядзём вынікі. Калі знайшлі грошы і набылі даволі дарагі матэрыял, то не палянуйцеся і зберагчы яго. Цяпер стаяць цёплыя чэрвеньскія дні і ночы. Плёнка нават шкодзіць, бо тэмпература пад ёю падымаецца да +35—+45 градусаў. Ні адна культура такіх умоў не вытрымлівае. Хіба што баклажаны ды кавуны. Так што знайдзіце магчымасць зняць палатно. Калі настануць халады (а яны будуць), вярніце на ранейшае месца.

НАДЗЁННАЕ

ЛЕТАПІС ЗДАБЫТКАЎ ЦЫВІЛІЗАЦЫІ, КУЛЬТУРЫ пішацца на працягу ўсёй гісторыі чалавецтва. Гэта няспынны працэс спадчыннай перадачы гістарычнага вопыту ўдасканалення грамадства і грамадскага быцця. І гэты летапіс пішацца рознымі сродкамі: мовы і літаратуры, паэзіі, выяўленчага мастацтва (жывапіс, графіка, скульптура), музыкі, кіно і г. д. Адзіным патрабаваннем для ўсіх з'яўляецца захаванне першапачатковай чысціні і адсутнасці напластаванняў, якія скажаюць сапраўднае аблічча.

ПОГЛЯД

ЦІ ЁСЦЬ СКАРЫНЕ МЕСЦА Ў МІНСКУ?

У другой палове 80-х гадоў архітэктары і мастакі горада Мінска пачалі конкурсныя распрацоўкі па ўстанаўцы ў горадзе помніка славутаму беларускаму асветніку, гуманісту і грамадскаму дзеячу Ф. Скарыне. На працягу некалькіх гадоў конкурснымі камісіямі было разгледжана шмат варыянтаў і прапаноў. У 1987 годзе журы конкурсу пад старшынствам народнага мастака Беларусі, акадэміка Нацыянальнай акадэміі навук, прафесара М. А. Савіцкага зацвердзіла праект помніка Ф. Скарыне, выкананы скульптарамі С. і Л. Гумілеўскімі, для ўстанаўлення на плошчы Свабоды. Але чамусьці невядома адкуль пачала высоўвацца ідэя размяшчэння помніка ля будынка прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук, — помніка архітэктуры сталіцы трыццатых гадоў XX стагоддзя. Напачатку манумент меркавалася паставіць на зялёнай клумбе, дзе зараз слуп з гадзіннікам, але раптам з'явілася рашэнне ўстанавіць скульптуру Ф. Скарыны на галоўнай лесвіцы параднага ўваходу, перад велічнай каланадай. У 1994 годзе кіраўніцтва акадэміі выказала сваю нязгоду з такой прапановай, паколькі відавочна істотна змянялася асяроддзе помніка архітэктуры — будынка прэзідыума Акадэміі навук. Аднак адпаведная заява кіраўніцтва акадэміі была пакінута без увагі.

Чатыры гады пра далейшы лёс помніка не было ніякіх чутак. Але зусім нядаўна кіраўніцтву акадэміі зноў быў прадстаўлены варыянт размяшчэння помніка Ф. Скарыне на каскадзе галоўнай лесвіцы, насупраць вядомай каланады.

Якія менавіта крытэрыі пераканалі журы шматлікіх конкурсаў у неабходнасці ставіць помнік менавіта тут, шырокаму колу грамадскасці дакладна невядома. Можна меркаваць, што было жаданне, каб манумент размяшчаўся менавіта на галоўным праспекце сталіцы. Магчыма, спакушалі і прывязка да скрыжавання праспекта з вуліцай Скарыны (зараз Акадэмічная). Магчыма, прывабліваді і нейкія ідэйныя памкненні: размясціць помнік у асяродку нацыянальнай навукі... Але сёння відавочна, што патрабаванні горадабудаўнічага развіцця, прынцыпаў сінтэтычнага спалучэння аб'ектаў манументальнага мастацтва і архітэктуры, законаў аховы помнікаў пры прыняцці рашэння аказаліся забытымі.

Арганізацыя прасторы архітэктурна-манументальнымі сродкамі мае выпрацаваныя тысячагоддзямі заканамернасці. Першымі памкненнямі тут былі ідэйна-псіхалагічныя, звязаныя з фіксацыяй месца, наданнем яму пэўнага значэння. Такімі знакавымі манументамі ў старажытнасці былі дальмены і іншыя мегалітычныя помнікі. У культурах старажытных цывілізацый, у прыватнасці, у Старажытным Егіпце, акцэнтамі месца з'яўляліся абеліскі, у антычных гарадах — агоры і форумы, трыумфальныя аркі. Усе яны грунтаваліся на арганічным спалучэнні архітэктуры і скульптурных формаў. Менавіта ў антычным горадабудаўніцтве пачалі фарміравацца законы спалучэння вуліцы і плошчы, камунікацыі і месца. Месца (плошча) з'яўлялася асяродкам грамадскага быцця, дамінуючым аб'ектам, у якім быў помнік ці манумент. У маштабе рэнесанснага еўрапейскага горада плошчы і знітоўваючыя іх вуліцы выглядалі як прамяністыя зоркі. Помнік на высокім п'едэстале фіксуе прастору і задае пэўны маштаб. Перыметр забудовы фарміруецца палацавымі фасадамі з ордэрным аздабленнем. Горадабудаўніцтва класіцызму імкнецца і вуліцу, якая звязвае плошчы, ператварыць у калідор палацаў. Аздобленыя каланадамі, порцікамі фасады фарміруюць вулічную забудову. Такім чынам, ідэйна значныя грамадскія месцы (плошчы) звязваюцца велічнымі праспектамі, ствараючы ўрачыстую перспектыву.

Антычная, рэнесансная і класічная архітэктуры выпрацавалі пэўныя мастацкія і ідэйна-эстэтычныя маштабы суадносінаў манумента і навакольнай прасторы. Аднак у любым выпадку ўсебакова ўлічвалася ўспрыманне помніка ў руху: як па напрамку вуліц, так і кругавога абходу. Змена ракурсаў і перспектыў ажыўляла статыку помніка, стварала ўмовы ўспрымання яго пластычных вартасцяў.

Такім чынам, пры вызначэнні месца для размяшчэння манумента ў інфраструктуры горада неабходна ўлічваць тры асноўныя фактары: прынцыпы развіцця ідэйнага і грамадска-культурнага асяроддзя горада; напрамкі горадабудаўнічага развіцця сувязяў «вуліца—плошча»; прынцыпы размяшчэння манументальных акцэнтаў і дамінантаў. Прывязка помніка Ф. Скарыны да прыступкаў будынка прэзідыума Акадэміі навук пазначаным аспектам не адпавядае.

Праспект Ф. Скарыны на ўчастку ад плошчы Незалежнасці да вул. Макаёнка даўно склаўся як завершаны і цэласны горадабудаўнічы ансамбль. У першыя пасляваенныя дзесяцігоддзі тут сфарміраваліся архітэктурныя комплексы ў асноўным неакласічнай стылістыкі, якія ўтвараюць шырокі і ўрачысты калідор палацавага відарысу фасадаў. Праз пэўныя інтэрвалы размешчаны плошчы: Незалежнасці, Кастрычніцкая, Перамогі, Якуба Коласа, Калініна. Праспект Ф. Скарыны ўжо мае працяг далёка на ўсход горада, і можна меркаваць, што ў гэтым напрамку таксама павінны быць прасторавыя рэкрэацыі з пэўнымі акцэнтамі. У такім разе, прытуліўшы помнік Ф. Скарыне да будынка акадэміі, аўтары парушаюць магчымыя перспектывы размеркавання манументальных дамінантаў.

Помнік такой грамадска значнай асобе, як Францыск Скарына, безумоўна, патрабуе пэўнай прасторы і архітэктурнага акружэння, якое б магло стаць стылеўтваральным асяроддзем для скульптуры. І ў гэтым разе адпаведныя ўмовы адсутнічаюць. Прастора скрыжавання праспекта Ф. Скарыны і вул. Акадэмічнай абмежаваная бакавымі крыламі будынка прэзідыума акадэміі і цалкам працуе на ўваход у будынак. Злучыўшы абодва крылы велічнай паўакружнай каланадай, І. Лангбард яшчэ больш акцэнтаваў гэта адчуванне. Каланада стала знітоўваючым элементам паміж экстэр'ерам і інтэр'ерам. Яна працягвае ў прасторы і часе працэс уваходу ў парадны вестыбюль-фае будынка. Пазначаныя эмацыянальныя адчуванні ўзмацняюць і тры напрамкі-прамяні лесвічных каскадаў. Размяшчэнне помніка на восі галоўнага ўваходу цалкам скажае замысел І. Лангбарда ў адносінах да арганізацыі прасторы ансамбля. Разам з тым у дадзеных умовах помнік не мае прасторы ўспрымання. Ён становіцца на напрамку руху людскіх патокаў са станцыі метро «Акадэмія навук» да вуліцы Акадэмічнай, 1-й клінічнай бальніцы і наадварот. Бакавыя відарысы абсалютна невыразныя. Не надта зразумела і арыентацыя помніка пры руху па праспекце Ф. Скарыны з усходу на захад. У гэтым разе фігура ўспрымаецца са спіны. Адзіная станоўчая кропка ўспрымання пры руху па праспекце ва ўсходнім напрамку недастатковая з-за кароткай дыстанцыі. Кругавы агляд такога значнага манумента ў гэтых умовах немагчымы. Зусім адмоўна помнік будзе ўспрымацца пры выхадзе з вестыбюля, перспектыву якога ён будзе закрываць і глядзецца цёмным сілуэтам ва ўмовах пастаяннага «контрасвятлення».

Не адпавядае прапанаваная прывязка помніка і прынцыпам гармоніі і сінтэзу архітэктуры і скульптуры. Па-першае, якога б маштабу ні быў манумент, ён адразу паставіць архітэктурны ансамбль будынка акадэміі ў становішча фону, кулісаў, што прывядзе да канчатковай страты эмацыянальнага ўспрымання помніка архітэктуры. Па другое, з-за адсутнасці прасторы паміж помнікам і архітэктурай (помнік ледзь не ўціснуты ў цела архітэктурных мас) назаўсёды зафіксуецца супярэчнасць паміж апошнімі. Ва ўсякім разе, побач з будынкам акадэміі нельга ствараць манумент, дамінуючы нават у гэтых абмежаваных прасторавых умовах. У такім разе губляецца сутнасць манументальнай скульптуры як акцэнта пэўнага месца.

Цяпер адносна помнікаў. Наўрад ці Францыск Скарына, чалавек шырокай адукацыі, гуманістычнага рэнесанснага светапогляду, знаёмы з архітэктурнымі шэдэўрамі Прагі, Рыма, Падуі, пагадзіўся б з такім неабгрунтаваным умяшаннем у архітэктурнае аблічча будынка акадэміі, са скажэннем замыслу аднаго з выдатных дойлідаў Беларусі, аўтара праектаў Дома ўрада, Вялікага тэатра оперы і балета, Дома Саветаў у Магілёве і інш. Закон Рэспублікі Беларусь «Аб ахове і зберажэнні гісторыка-культурнай спадчыны» забараняе навукова неабгрунтаваныя змены помніка, уключаючы асяроддзе, пагаршэнне ўмоў успрымання (артыкул 5, п. 5,6). Нельга ўмешвацца ў асяроддзе помніка і з пункту гледжання рэжыму яго ахоўных зон (артыкул 29).

Як ужо адзначалася, навукова абгрунтаванай можа быць устаноўка манумента толькі ў адпаведнасці з горадабудаўнічай канцэпцыяй размяшчэння аб'ектаў манументальнага мастацтва. Аднак кіраваліся не канцэпцыяй (відаць, яе няма), а прыватным выпадкам. І кіравалі рашэннем не законы сінтэзу мастацтваў, а наспелая ў грамадскай свядомасці патрэба паставіць помнік Ф. Скарыне, і ўсё. Зразумела, што прасцей прывязацца да архітэктурнага ансамбля, бясспрэчныя вартасці якога агульнапрызнаныя. А чаму б, напрыклад, не спалучыць устаноўку помніка з фарміраваннем новага архітэктурнага ансамбля, у прыватнасці, комплексу Нацыянальнай бібліятэкі на скрыжаванні праспекта Ф. Скарыны і вул. Філімонава? Гэта развіло б сістэму дамінантаў праспекта і істотна ўзбагаціла б архітэктурна-горадабудаўнічае асяроддзе ўсходняй часткі горада. Магчымы і варыянт на Кастрычніцкай плошчы, што ўзмацніла б эмацыянальную сувязь з размешчаным побач Верхнім горадам...

Такія значныя манументы ставяцца не на тры гады і не на дзесяць, а на стагоддзі. І непакоіцца пра тое, каб не спазніцца, няма падстаў. Патрэба ў помніку Францыску Скарыне будзе актуальнай заўсёды.

Аляксандр ЛАКОТКА,
архітэктар, доктар гістарычных навук.

Здаецца, не так даўно мяне самога «адкрывалі» старэйшыя пісьменнікі... Аднак перапыным уздых шкадавання аб хуткаплынным, незваротным часе — і да справы.

Мяне заўсёды цікавіла такое спецыфічна беларускае пытанне: якімі шляхамі прыходзіць чалавек да роднай мовы? (Спецыфічна беларускае, бо паспрабуйце задаць гэтае пытанне якомусьці французу, ці эстонцу, ці рускаму, і ўбачыце іхнюю рэакцыю.) Неяк спытаў у Анжэлы: «Ты, мабыць, ездзіла ў вёску, да бабулі, і там вучылася мове?» Аказваецца, не, нікуды не ездзіла — «проста ў мяне была сяброўка, мы з ёю размаўлялі і вучыліся адна ў адной». Вышэй напісаў слова «адкрываць», але для тых, хто больш-менш пільна сочыць за сучасным беларускім літаратурным працэсам, імя Анжалікі Дубасавай павінна быць ужо вядома. Яна рэгулярна друкуецца ў часопісе маладых літаратараў «Першацвет», піша апавяданні, вершы, крытычныя артыкулы і рэцэнзіі, адной з якіх, дарэчы, дэбютуе ў чэрвеньскім нумары часопіса «Полымя». Як бачым, набыткі не такія і малыя, асабліва калі ўлічыць, што Анжэле... толькі 17 гадоў. Яна — сёлетняя выпускніца мінскай сярэдняй школы. Нядаўна ўдзельнічала ў Рэспубліканскай алімпіядзе па беларускай мове, выйшла пераможцаю, і гэта дае ёй права паступіць без уступных іспытаў на філфак БДУ. Застаецца толькі парадавацца за гэтую сціплую, прыгожую, таленавітую дзяўчыну і пажадаць ёй шчаслівага лёсу — і ў жыцці, і ў літаратуры.

Андрэй ФЕДАРЭНКА.

НА КОНКУРС «ЗВЯЗДЫ» І САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ

Анжаліка ДУБАСАВА



КАЛІ ПАМІРАЕ СЯБРОЎСТВА

АПАВЯДАННЕ

Калі памірае сяброўства —
Жаданні знікаюць. Зусім.

НАДЗЕЯ ПРАЧНУЛАСЯ ў чатыры гадзіны раніцы, каб не прапусціць усход сонца.

«Усход — гэта нараджэнне, — думала дзяўчына, стоячы на балконе, — нараджэнне — гэта спадзяванні, якія мне зараз вельмі патрэбны...»

Сонца яшчэ не паказалася, але неба жыло ў прадчуванні яго.

«Я існую на сотнях планет, — разважала Надзея. — Іх паўднёвыя полюсы маюць назву Сябар, паўночныя — Вораг. Я чамусьці збольшага знаходжуся на Экватары — мусіць, таму, што так бяспечней. На некаторых планетах я ў паўночным паўшар'і, на некаторых — у паўднёвым. Знаходзіцца на Поўначы — канешне, не самае лепшае, але нашмат горш, калі ты там не па сваёй волі, калі ты імкнешся на Поўдзень, а абставіны не пускаюць, і той, каго марыш называць сябрам, завецца ворагам. Жахліва!»

На гарызонце ўзнік маленькі скрылік сонца.

«Я жыву на сотнях планет, — зноў падумала Надзея. — І адна з іх — мой боль. Калі два чалавекі знаходзяцца па адзін бок экватара, гэта шчасце альбо бяда, а калі па розныя — катастрофа. Што можа быць больш жудасным за становішча, калі цябе лічаць ворагам, а ты бачыш у чалавеку сябра?»

Сонца канчаткова выйшла са свайго сховішча.

«Дзіўна, — адзначыла Надзея. — Дзень нарадзіўся, хоць сяброўства памерла».

І нечакана для сябе прамовіла:

Калі памірае знічка,
Можна загадваць жаданне,

Калі памірае сяброўства —
Жаданні знікаюць. Зусім.

Неспадзявана балкон зачыніўся. Надзея спалохалася. Яна падышла да дзвярэй — дзверы былі зачыненыя. Яны не пускалі. Што ж гэта такое?!

Надзея адчула, як нейкая сіла штурхае яе да парэнчаў балкона. «Не, прабачце! Нічога ў вас не атрымаецца! Жаданне жыць застаецца!» І дзверы раптам адчыніліся.

— Што гэта было?!

— Нічога, — адказаў нехта.

Надзея ашаломлена азірнулася. І ўспомніла ўчарашні тэлефонны званок.

Было цёмна, але яна спяшалася хутчэй падняць трубку і таму не ўключыла святло. Маці была на кухні.

У трубцы нейкі час маўчалі, адно штосьці шумела, нібы тэлефанавалі з-пад зямлі. Затым нечы знаёмы голас пачаў распытваць, як справы, як маці; Надзея адказвала, намагаючыся зразумець, хто звоніць. Урэшце яна спытала, ці паклікаць маму, але, на здзіўленне, атрымала адмоўны адказ, а неўзабаве пачула кароткія гудкі.

«Успомніла! — жахнулася Надзея, стоячы цяпер на балконе. — Такі ж голас у цёткі Клавы, якая нядаўна памерла!»

Дзяўчыну апанаваў такі страх, што падалося, быццам бялізна, вывешаная сохнуць на балконе, пачала пераліваццa рознымі колерамі.

— Усё будзе добра, — сказаў хтосьці.

«Якое шчасце было б зараз прачнуцца! Як шкада, што я не сплю!»

— Сяброўства не памерла, — ізноў пачуўся таемны шэпт. — Сяброўства ніколі не памірае. Яно можа быць толькі распятае...

— Што ж мне рабіць? — наважылася і спытала ў гэтага кагосьці Надзея.

— Жыві. Проста жыві. І не скарайся.

КРЫМІНАЛ

АДПОМСЦІЛА БРАТУ...

Махлярствы, якія ўчыняюцца з выкарыстаннем плацежных дакументаў, усё часцей фігуруюць у крымінальнай статыстыцы. Таварна-транспартныя накладныя, бланкі даверанасцяў, плацежных даручэнняў не маюць элементарных ступеняў абароны, і часам друкуюцца на паперы нізкай якасці. Падрабіць «плацежку» і даверанасць прасцей простага. «Народныя ўмельцы» выраблюць неабходныя пячаткі за некалькі гадзін.

Прыватны прадпрымальнік Наталля Ціханава няўэдка дапамагала свайму брату — дырэктару таварыства з абмежаванай адказнасцю «Вераск» у атрыманні тавару са складоў у Мінску. Некалькі паездак з Барысава ў сталіцу — і Ціханаву ў твар ведалі работнікі складоў, а яна дасканальна засвоіла механізм атрымання тавару.

Усё ішло добра ў сямейным бізнесе, пакуль паміж братам і сястрой не прабегла чорная кошка. Як растлумачыла на следстве Ціханава, шаноўны брацік своечасова не вярнуў сястры доўг. Зразумеўшы, што бліжэйшы сваяк доўг вяртаць і не збіраецца, Наталля вырашыла вярнуць яго сама, а заадно і «пакараць» брата.

Друкарскіх спраў майстры па заказу вырабілі для Ціханавай дзве пячаткі: «ТАА «Вераск» і «Аграпрамбанка». Узяўшы выраблены дублікаты пячатак і чыстыя бланкі плацежных даручэнняў і даверанасцяў, Ціханава на грузавой аўтамашыне прыватнага прадпрымальніка Уладзіміра Крывадубскага, які ні сном ні духам не ведаў пра «чорныя» задумы жанчыны, выехала ў Мінск.

Першай ахвярай «мсціўца» абрала прыватнага прадпрымальніка Ірыну Барадзіч, на складах якой яна неаднаразова атрымлівала для брата пладова-агароднінную прадукцыю. І на гэты раз работнікам склада яна прад'явіла плацежнае даручэнне на 60 мільёнаў рублёў ад імя ТАА «Вераск». Не адчуўшы падману і не праверыўшы праз бухгалтэрыю паступленне грошай (час быў абедзенны), тыя далі ўказанне аб загрузцы аўтамашыны. Апельсіны, ананасы, лімоны, ківі, манга і іншыя экзатычныя фрукты занялі сваё месца ў кузаве аўтамашыны.

Праз паўгадзіны Ціханава нанесла візіт на другі склад той жа Ірыны Барадзіч і загрузіла ў аўтамашыну 717 кілаграмаў памідораў на суму 24 мільёны 754 тысяч рублёў. Намеснік загадчыка склада Людміла Арэх здагадалася праверыць правамернасць водпуску тавару толькі пасля таго, як гружаная аўтамашына выехала за вароты склада. На тэлефонны запыт з Барысава адказалі, што машыну ў Мінск не пасылалі і нікога не ўпаўнаважвалі атрымліваць экзатычныя ананасы і галандскія памідоры ў Мінску. Арэх нічога не заставалася, як паведаміць пра здарэнне «шэфу» і ў міліцыю.

На складзе ТАА «Красіко» рэсоры аўтамашыны прыкметна аселі пасля таго, як у яе пагрузілі мясныя і рыбныя кансервы, а таксама іншыя далікатэсы амаль на 30 мільёнаў рублёў. Аб тым, што іх фірму «кінулі» на такую суму, самі фірмачы даведаліся толькі ў міліцыі.

Пасля трох загрузак у аўтамашыне яшчэ заставалася месца, таму Ціханава дала каманду заехаць на склад ЗАТ «СОАТ». Менеджэры таварыства не ўстаялі перад чароўнай усмешкай маладой жанчыны і, узяўшы «плацежку» на 45 мільёнаў рублёў, адразу ж распарадзіліся загрузіць машыну рэпчатай цыбуляй. Праўда, выйшла невялікая няўвязка: «аплачаная» цыбуля не ўмяшчалася ў амаль загружаную машыну. Загрузілі толькі 3473 кілаграмы, а астатнія Ціханава пакінула «пад слова гонару» пад аховай менеджэраў, паабяцаўшы заехаць на наступным тыдні.

Прыемныя ўспаміны пра маладую жанчыну тут жа зніклі, калі менеджэр Андрэй Войнаў пазваніў у бухгалтэрыю, дзе яму сказалі, што ад ТАА «Вераск» за адпушчаныя тры з паловай тоны цыбулі не атрымана ні капейкі.

Між тым, гружаную агароднінай і фруктамі аўтамашыну шукалі па гораду работнікі міліцыі. І, як аказалася, не без поспеху. Праз чатыры гадзіны пасля пачатку акта «помсты» брату, г. зн. у 17 гадзін, Ціханава была затрымана пры выездзе з Мінска. У яе была яшчэ адна нявыкарыстаная «плацежка» на атрыманне прадукцыі амаль на 50 мільёнаў рублёў у цяплічнай гаспадарцы ЗАТ «ДОРОРСА» ў вёсцы Замастоўча Мінскага раёна.

Усяго за 4 гадзіны Ціханава, выкарыстоўваючы падробленыя плацежныя дакументы, «на авось» ад імя ТАА «Вераск» выкрала прадукцыі амаль на 153 мільёны рублёў.

Ну, а няўдалая махлярка па прыгавору суда Заводскага раёна Мінска атрымала за эканамічную помсту брату тры гады пазбаўлення волі ўмоўна з накіраваннем на будоўлі народнай гаспадаркі. Выкрадзенае вернута пацярпелым.

Мікалай КРАСНЕЎСКІ,
грамадскі карэспандэнт аддзела права і маралі.

BELFLON
ЗАО "БЕЛФЛОН"
РЕМНИ
КЛИНОВЫЕ А, В(Б), С(В), D(Г),
ВЕНТИЛЯТОРНЫЕ,
ВАРИАТОРНЫЕ,
ДЛЯ КОМБАЙНОВ "НИВА", "ДОН",
КОМПЛЕКТЫ РЕМНЕЙ
ПЛОСКИХ ДЛЯ ПРП-1,6
РУКАВА
НАПОРНЫЕ, ГОФРИРОВАННЫЕ,
БЕНЗОСТОЙКИЕ,
ВЫСОКОГО ДАВЛЕНИЯ,
ПИЩЕВЫЕ, ДЛЯ ПАРА
Минск (017) 232-10-08
(017) 232-93-85
(017) 231-13-88
Витебск (0212) 96-42-38
Могилев (0222) 24-19-73
Гомель (0232) 49-88-22

ВІНШАВАННІ

*Сардэчна віншуем з днём нараджэння **Алёну Віктараўну ГУРЫНОВІЧ.** Жадаем шчасця, здароўя і ўсяго самага найлепшага.*

Бацькі, дзеці,
г. Салігорск.

*Віншуем з днём нараджэння **Сяргея Віктаравіча ТАЛЭЙКУ** з в. Доктаравічы Капыльскага раёна. Жадаем моцнага здароўя, шчасця, ладу і дабрабыту ў сям'і.*

Жонка, дзеці.

*Віншуем дачку **Надзею Валянцінаўну ДУБРОЎКА** з г. Слоніма з днём нараджэння. Жадаем здароўя, шчасця, радасці і ўсяго найлепшага.*

Бацькі, брат.

***Марыі Канстанцінаўне НАВУМЧЫК** з в. Зарэчка з нагоды юбілею жадаем здароўя, шчасця, поспехаў.*

Сын, нявестка, унучка.

*Віншуем дарагую, родную, любімую мамачку **Кацярыну Дзянісаўну ХАРКО** з в. Малажын з днём нараджэння. Жадаем моцнага здароўя, доўгіх гадоў жыцця ў добрых клопатах і душэўным спакоі.*

Муж, дзеці, унукі.

ООО «ТАВО»
ЛИКВИДИРУЕТСЯ.
Претензии принимаются в течение 2 месяцев.

Наступны нумар «Звязды» выйдзе ў пятніцу, 31 ліпеня.

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Рэгістрацыйны нумар 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ.
Рэдакцыйная калегія: У. АНДРЫЕВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), І. БАРАНОЎСКІ, У. ГОЙТАН, Л. ЛАХМАНЕНКА, М. МІХАЕВІЧ (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. МЯСНІКОЎ, Л. РЫЖАНКОВА (намеснік галоўнага рэдактара), С. ШАЎЦОЎ.

НАШ АДРАС: 220013, гор. Мінск, вуліца Б. Хмяльніцкага, 10-а, рэдакцыя газеты «Звязда».
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай — 68-29-19; намеснікаў галоўнага рэдактара — 32-44-12, 32-14-25, 32-35-05; аддзелаў: інфармацыйна-аналітычнага — 32-38-02, 68-28-14, 68-29-68, эканомікі — 32-31-21, 68-29-68, палітыкі — 68-27-57, 68-28-64, культуры — 68-29-42, 68-28-27, сацыяльных праблем — 68-28-69, пісьмаў — 68-27-47, маралі і права — 68-28-51, міжнацыянальных адносінаў — 68-27-40, 68-28-69, журналісцкіх расследаванняў — 68-28-38, 68-28-72, знешнеэканамічнай дзейнасці — 68-29-44; аглядальнікаў па праблемах: навукі і адукацыі — 68-28-31, экалогіі і ліквідацыі вынікаў Чарнобыля — 68-28-36; уласных карэспандэнтаў: у Гродне — 33-25-29, Гомелі — 53-13-92, Баранавічах — 7-26-02, Магілёве — 31-13-75, Паставах — 26-562; бухгалтэрыі — 32-22-03; даведкі па рэкламе і аб'явах — 32-04-52, 32-31-98. ФАКС: 68-27-79. E-mail: daily@zwyazda.belpak.minsk.by. http://www.zvyazda-daily.minsk.by.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з чытачамі. Матэрыялы, пазначаныя значком носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Друкарня выдавецтва «Беларускі Дом друку». Мінск, праспект Ф. Скарыны, 79.
Тыраж 80 755. Індэкс 63850.
Зак. № 4464.
Выходзіць 250 разоў на год.
Нумар падпісаны ў 20.15.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12